Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 43 (2841) Год LV | Беласток, 24 кастрычніка 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Бібліятэкі ☞ 5

Анатоль Парэмбскі ☞ 8

БОЛЬШАМУ ПАРКУ — НЕ!

Раней назіральнікі за размовамі ў справе пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку лічылі, што Нараўчанская гміна можа быць першай, якая дасць згоду на павелічэнне парку на сваёй тэрыторыі. Мелася таксама ўражанне, што ўлады Белавежскай і Гайнаўскай гмін чакалі рашэння Рады Нараўчанскай гміны ў гэтай справе. Дарогу да такіх рашэнняў адкрыла падпісанне ў пачатку верасня Белавежскай праграмы развіцця прадстаўнікамі Міністэрства асяроддзя, Дзяржаўных лясоў, Белавежскага нацыянальнага парку, Ваяводскага фонду аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі, прадстаўніком Маршалкоўскай управы, гайнаўскім старастам Уладзімірам Пятрочукам і нараўчанскім войтам Міколам Павільчам.

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Само падпісанне Белавежскай праграмы развіцця нічога не вырашала ў справе пашырэння парку, але давала гарантыю, разам з падпісанай раней у Ваяводскім фондзе аховы асяроддзя і воднай гаспадаркі прамесай, на атрыманне 70 мільёнаў злотых, у якасці дапамогі для гмін Гайнаўскага павета на інвестыцыі ў ахову асяроддзя і развіццё турызму, у выпадку падтрымання раднымі ідэі павелічэння парку. Прыгадаю, што Нараўчанская, Гайнаўская і Белавежская гміны, на якіх тэрыторыі меў бы быць павялічаны БНП (прыблізна на звыш тры тысячы гектараў у кожнай з гмін), мелі б атрымаць па 18 млн. зл. дапамогі, да якой мелі б дакладваць па 15% уласных сродкаў. Менавіта на гэтыя ўласныя сродкі выдзеленых было 5 млн. зл. у якасці беспрацэнтных крэдытаў для згаданых трох гмін. У Белавежскай праграме развіцця гарантуецца таксама, што жыхары Гайнаўскага павета будуць мець доступ да драўніны з парку для абагравання сваіх дамоў і будуць маглі збіраць у парку па-за запаведнікамі грыбы, ягады, маліны і іншыя плады лесу так, як можна гэта рабіць на тэрыторыі Дзяржаўных лясоў.

— Як на сённяшнія магчымасці мы выпрацавалі аптымальныя ўмовы, на якіх можа быць пашыраны парк. Цяпер не ўдасца ўжо больш атрымаць, — заявіў раней нараўчанскі войт Мікола Павільч.

Як станоўчы кампраміс паміж спадзяваннямі мясцовага грамадства і фінансавымі магчымасці дзяржаўнага бюджэту ў перыяд фінансавых цяжкасцей у Польшчы ацанілі Белавежскую праграму развіцця радныя Нараўчанскай гміны. Аднак на папярэдняй сесіі радныя вырашылі правесці грамадскія кансультацыі з насельніцтвам.

— За павелічэнне парку прагаласавалі толькі ў Лешуках. У Міклашэве 2 асобы галасавалі за пабольшанне парку, 2 былі супраць, а ўсе астатнія стрымаліся ад галасавання. Мы жывем далей ад пушчы і ў нашых гаспадароў ёсць свой лес, таму і так многа людзей стрымалася ад галасавання, — сказаў радны з Міклашэва Ян Драўноўскі. — Пасля выступлення на сесіі нашага войта, які растлумачыў нам пра магчымую фінансавую дапамогу ў выпадку пашырэння парку, я сам спачатку быў за яго павелічэннем і так меркавала большасць нашых радных. За 18 мільёнаў, якія мы мелі атрымаць, многа ж можна было б зрабіць у нашай гміне, бо апошнім часам нашы прадпрыемствы горш трымаюцца і менш падаткаў ідзе ад іх у гмінны бюджэт. Мелі ж за дзяржаўныя сродкі будаваць каналізацыю у тых вёсках, дзе яе яшчэ няма, ставіць на дамах салярныя вадагрэйныя ўстаноўкі, а пры раскінутых па хутарах хатах будаваць ачышчальныя ўстаноўкі.

Вясковыя сходы адбыліся ў 19 мясцовасцях і аказалася, што з ліку 328 галасуючых жыхароў Нараўчанскай гміны ажно 71,6% выказалася супраць пашырэння Белавежскага парку.

— Нашы жыхары апасаюцца, каб не паўтарылася тое, што было ў 1996 г., калі быў пабольшаны парк і не былі стрыманы дадзеныя самаўрадам фінансавыя абяцанні. Людзі апасаюцца таксама, што будзе менш месц працы ў лясной галіне і будзе абмежаваны доступ да драўніны для абагравання дамоў, — сказаў пасля кансультацый войт Мікола Павільч.

— Калі б самаўрадавыя выбары былі праз два-тры гады, магла б быць тады згода нашай Рады на пашырэнне парку, але выбары ўжо на носе і радныя не будуць прымаць непапулярных пастаноў перад самымі выбарамі. Я думаю, што 13 кастрычніка ўсе нашы радныя будуць супраць праекта пабольшання парку, бо ніхто не схоча галасаваць інакш, чым прагаласавалі жыхары. Я і сам буду галасаваць супраць пашырэння парку, бо калі б быў за паркам, людзі не перавыбяруць мяне на раднага, — заявіў адзін з радных Нараўчанскай гміны. — Нашы жыхары бачаць, што ў парку марнуецца многа драўніны і таму так многа людзей выказваецца супраць пашырэння парку. Сохнуць там знішчаныя караедамі дрэвы, а калі і высякаюць сухастой, то пасля нельга забраць яго з лесу. Калі парк не будзе пабольшаны, то ў Дзяржаўных лясах могуць зрабіць больш запаведнікаў і інакш будуць ахоўваць пушчу. Нават могуць моцна абмежаваць продаж драўніны з Дзяржаўных лясоў і мы не зможам нічога зрабіць, каб памяняць гэта, і застанемся без дзяржаўных грошай на інвестыцыі.

Нават раніцай 13 кастрычніка мелі яшчэ весціся размовы ці трымацца гэтай версіі, але галасаванне на сесіі Рады Нараўчанскай гміны паказала, што закончыліся яны безвынікова. Нараўчанскі войт Мікола Павільч абвясціў вынікі кансультацый, коратка расказаў пра засцярогі і боязь, якія паяўляліся на сходах і пасля выступлення двух радных, якія моцна пакрытыкавалі гаспадаранне ў Белавежскім нацыянальным парку, адбылося галасаванне — усе 15 радных выказаліся супраць пашырэння Белавежскага нацыянальнага парку. На пытанне журналістаў ці не шкада, што Нараўчанская гміна не атрымае вялікай грашовай дапамогі, на якую магла б разлічваць, калі б дала згоду на пашырэнне парку, войт Мікола Павільч заявіў: „Усяго шкада і грошай таксама. Аднак такая воля людзей, а маем дэмакратыю. Тыя, што ўдзельнічалі ў сходах вырашылі так і трэба іх думку шанаваць”.

— На сходзе ў Семяноўцы ўсе былі супраць прапанове пабольшання парку, то і я так галасаваў на сесіі, — сказаў пасля галасавання радны Славамір Кулеша.

Ён і іншыя радныя перш за ўсё шкадаваліся, што многа паваленай на зямлю якаснай драўніны, якую можна было б нават выкарыстаць у будаўніцтве, марнуецца ў Белавежскім нацыянальным парку. Радныя прапанавалі аддаць яе дарам для пацярпелых у час сёлетніх паводак і пераконвалі, што неадпаведная гаспадарка драўнінай у парку гэта адна з галоўных перашкод, якая тармозіць пашырэнне парку. Паявіліся таксама папрокі, што людзі, якія выказваюцца за большую ахову пушчы, не хочуць спатыкацца з мясцовым насельніцтвам і пераконваць яго да сваіх поглядаў, а толькі крытыкуюць прыпушчанскі народ.

— Перакананне, што паваленыя дрэвы ў парку гэта марнатраўства — памылковае і вынікае з няведання і неразумення прыроды, — заявіў прысутны на сесіі дырэктар БНП Здзіслаў Шкіруць і дадаў, што не хапіла адукацыйнай працы сярод жыхароў прыпушчанскіх гмін.

Кансультацыі ў справе праекта пабольшання Белавежскага парку пачалі праводзіцца таксама ў час вясковых сходаў у Гайнаўскай гміне.

— На сходзе ў Трывежы сабралася многа людзей і ўсе галасавалі супраць пабольшання парку. Грошы, якія далі б нам, хутка разышліся б, а невядома яшчэ колькі з прапанаваных атрымалі б мы. Улады Міністэрства асяроддзя не размаўляюць непасрэдна з нашымі людзьмі. Няхай раней пракладуць газаправод да нас, а пазней гавораць пра пашырэнне парку, — сказаў солтыс Трывежы Канстанцін Салавянюк.

На падставе ранейшых выказванняў войтаў і радных Гайнаўскай і Белавежскай гмін можна спадзявацца, што супраць прапановы пабольшання парку будуць таксама рады гэтых дзвюх гмін, дзе мясовае насельніцтва найхутчэй таксама не падтрымае ідэі пашырэння Белавежскага парку ў час кансультацый. Аднак змаганне за большы парк можа не закончыцца галасаваннямі на Гайнаўшчыне. Прыхільнікі экалагічных арганізацый збіраюць ужо подпісы пад законапраектам, які хаця прадбачвае кансультацыі з мясцовым насельніцтвам і мясцовымі самаўрадамі, то нават пры іх адмоўным стаўленні дае магчымасць прыняць рашэнне аб пабольшанні парку. Цяжка зараз сказаць ці ёсць рэальны шанц, каб такі закон прыняў парламент.

9 770546 196000

Дзень Радыё Рацыя

Трынаццатага кастрычніка, зранку, сеў я ў машыну, і, як заўсёды, уключыў радыё, каб паслухаць, што на свеце робіцца і як і якая радыёхваля асвятляе адну і тую ж падзею. Вельмі цікава бывае прааналізаваць беларускія радыёстанцыі і параўнаць іх з Радыё Рацыя, якое таксама чуваць у Гародні. Насмяешся часамі з таго, як умеюць некаторыя „акулы пяра" пераварочваць усё з ног на галаву. Пасля пасумуеш з нікчэмнасці чалавечай натуры, якая так нахабна ўмее адну і тую ж падзею трактаваць процілегла нават не за самыя вялікія грошы. А пасля пераключышся выключна на хвалю Радыё Рацыя і думаеш, што не пашкодзіла б усім гарадзенцам рабіць менавіта так.

Дык вось, у гэты дзень хацеў я зрабіць гэтак жа, як і заўсёды. Глынуць надумаўся, так бы мовіць, крыху рознабаковай інфармацыі. Як ніяк, але ў нас выбары. І не абы-якія, а прэзідэнцкія. Цікавасць да таго, што вяшчаюць хвалі розных роўняў і ўзроўняў — патроеная. Націскаю, значыць, гузік адной з айчынных радыёстанцый, а там цішыня. Націскаю другі — зноў ціха. Як ноччу на Марсе (у бязветранае надвор'е, зразумела). Што гэта, думаю, здарылася? Маўчаць усе хвалі, акрамя Радыё Рацыя! А Радыё Рацыя аж заліваецца, як салаўі пры закаханых.

Можа, мяркую сам сабе, ужо дэмакраты перамаглі на выбарах, а я нешта недагледзеў? А можа, хоць і дата трынаццаць, гэта дзень, калі збываюцца мары беларусаў? У тым ліку і мая мара, каб усе слухалі Радыё Рацыя, таксама збылася? Вось бы яшчэ, мару сабе далей, сталі масава атрымліваць і чытаць беластоцкую „Ніву". Тут ужо сапраўды поўная гармонія мараў і рэаліяў надышла б. І тады трынаццатага кастрычніка можна было б лічыць большай датай здзяйснення беларускіх мараў, чым Новы год. І нават большай, чым стары Новы год.

Але паслухаўшы крыху адзінае радыё, якое ў гэты момант было чуваць у Гародні, вельмі хутка зразумеў, што мая радасць заўчасная. Журналісты гэтай хвалі (чаму я яе ўсім і рэкамендую) вельмі аператыўна растлумачылі мне, што ў гэты дзень, у Крамлі, праходзіць прэсканферэнцыя для беларускіх журналістаў. І даюць яе рускія палітыкі. Нават сам кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта Расіі Сяргей Нарышкін падвергнуў жорсткай крытыцы беларускі рэжым. Той рэжым, які фінансавалі з Крамля, падтрымлівалі, і ў якога многаму навучыліся.

Сапраўды, расійскае кіраўніцтва вельмі хутка вучыцца. І вучыцца ў беларускага прэзідэнта. Вучыцца ўсяму, чаму толькі можна. Прыкладам, прэзідэнцкую вертыкаль яны змалпавалі па беларускім узоры. Прызначэнне губернатараў — таксама. І даваць прэс-канферэнцыі для журналістаў суседняй дзяржавы першым пачаў беларускі кіраўнік. Каб беларускі ўрад запатэнтаваў усе гэтыя вынаходніцтвы ў сферы манеўраў для ўтрымання ўлады, то маглі б браць з Расіі за гэта газ і нафту задарма. Рускія яшчэ і прыплачваць мусілі б.

Але зараз не пра гэта. Так дзіўна супала, што расійскія тэлеканалы, якія трансляюць на Беларусь, акурат у дзень гэтай прэсавай канферэнцыі зачыніліся на нейкую прафілактыку. Замкнуліся, значыць. Ці калі выславіцца больш дакладна — заткнуліся. Супадзенне дзіўнае, але цалкам лагічнае і зразумелае. Расійскія тэлеканалы з задавальненнем раскажуць беларускаму народу, як сённяшняе расійскае кіраўніцтва незадаволенае сваімі беларускімі васаламі. А гэтага беларуская ўлада дапусціць не можа. Не можа ў прынцыпе, а зараз, калі ўжо поўным ходам шпараць прэзідэнцкія выбары, тым больш. Таму і завесілі блакітныя экраны расійскіх тэлеканалаў непраглядной завесай беларускай прафілактыкі. А вось чаму беларускія радыёхвалі замаўчалі, тут можна толькі здагадвацца. Можа які чыноўнік пачуў зранку і з пахмелля, што трэба рабіць прафілактыку нечага там, невядома чаго. І, каб не памыліцца, адпрафілактораў усё што змог. І тэлеканалы, і радыёхвалі. І расійскія, і свае. На ўсялякі выпадак. Каб не памыліцца.

Але няма гора без дабра. Пакуль праходзіла прафілактыка беларускага рускамоўнага эфіру, аўтамабілісты ў пошуках жывой хвалі ў Гародні пазнаходзілі толькі 98,1 ФМ. Таму дату трынаццатага кастрычніка на Гарадзеншчыне можна лічыць днём Радыё Рацыя і адзначаць яе штогод.

Віктар САЗОНАЎ

Дзядзька Хонекер

З некалькіх з'ездаў савецкай кампартыі, якія адбыліся пры маёй памяці, запамятаўся мне адзін — XXIV з красавіка 1971 года, — але не з прычыны нейкай яго асаблівай важнасці, але па прычыне вельмі хітрай метамарфозы, якая на ім здарылася. Менавіта на з'езд у Маскву прыехала дэлегацыя таварышаў з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, якую ачольваў Вальтэр Ульбрыхт, а ўжо ў ходзе з'езду газеты сталі — быццам нічога асаблівага не сталася — пісаць, што гэтую ж дэлегацыю ўзначальвае Эрых Хонекер. Так спадцішка саветы выканалі ракіроўку ўсходненямецкага партыйнага кіраўніцтва; фармальная змена гедээраўскага лідэра адбылася некалькі тыдняў пазней у Берліне. Заходненямецкія газеты напісалі на гэты конт, што Ульбрыхта скінулі з пасады, бо завысока задзёр нос перад крамлёўскімі давернікамі ды з'едліва пракаментавалі, што стаў ён ахвярай сістэмы, якую сам руплівa ўкараняў. Дадам яшчэ, што дакументы таго з'езду прыводзяць адну яго важную канстатацыю: „В процессе социалистического строительства сложилась новая историческая общность людей — советский народ"...

Капээсэаўскія з'езды канулі ў Лету, але той савецкі народ астаўся, асабліва ў адной хітранькай краіне — Беларусі, дзякуючы яе лідару, які вельмі рупіцца пра захаванне захаплення сваёй — здамінаванай культам Масквы, вайны і змагання — маладосці, пра жыццё ў вялікай агульнай казарме заміж у прытульным сваім доміку. Той лідар яшчэ больш размашыста шагае следам таварыша Ульбрыхта і стараецца, каб ягоная краіна стала больш савецкай за Савецкі Саюз і больш расійскай за самую Расію, праводзячы маштабную русіфікацыю і вертыкалізацыю, раздаючы пры нагодзе высокія дзяржаўныя пасады замежнікам-„інтэрнацыяналістам".

Свайго роду шахматная крамлёўская звычка — праводзіць ракіроўкі нявыгадных сабе людзей у васальных даміньёнах ці перастаноўкі іншых рэлятыўных пешак і фігур — жыве надалей. Згаданая ўсходненямецкая падмена адбылася даволі аксамітна, інакш справы выглядалі ў Венгрыі і Чэхаславакіі, а ў Польшчы — з-за савецкай крыху ранейшай ангажаванасці менавіта ў Венгрыі, Чэхаславакіі ды Афганістане — падзеі гэтыя выглядалі нават у нейкай ступені самацечнымі. Не так даўно адбылася, здаецца мне, спроба паставіць новага грузінскага ферзя, але не ўдалася, бо там народ празмерна рассаветызаваўся. Ды зараз маскоўскім паліташахматыстам шораз больш нявыгадным становіцца і не надта пакорлівы ўладар той стаханаўскай краіны — Беларусі. Разведка боем перад намечанай баталіяй ужо пачалася: пакуль па Бацьку нанесены першыя медыйныя ўдары, а на ўнутраным расійскім фронце адбылося сёлета паказное выдварэнне не надта выгадных вярхоўнаму тандэму фігур: губернатара Калінінграда Георгія Бооса і мэра Масквы Юрыя Лужкова.

Які ж варыянт даводзіцца прадбачваць Беларусі, калі цяперашняе маскоўскае кіраўніцтва рашыцца прыбраць „муху з катлета": аксамітны ці шорсткі? Апошні здаецца мне амаль неверагодным. Бо ж беларусы так прывыклі жыць у той агульнай казарме пад маскоўскімі загадамі, што многія з іх не ўяўляюць іншага і шорсткі душ мог бы іх небяспечна працвераziць. А аксамітны варыянт вельмі перспектыўны, калі нават браць пад увагу блізкія прэзідэнцкія выбары. Бо ж паводле кампетэнтных наглядальнікаў гэтыя выбары, што адбываюцца ў Беларусі, не ўлічваюць галасоў саміх выбаршчыкаў, улічваюць толькі загадныя галасы начальства. І пакуль тое начальства адно — іх вынік лёгка спрагназаваць. А калі ж у выбары ўмяшаецца іншае начальства, з сакралізаванага цяперашнім начальствам боку, і загадае свой, іншы выбар...

Аляксандр Лукашэнка, так як калісь Вальтэр Ульбрыхт, узвёў у сваёй краіне аўтарытарную сістэму, аснаваную не на рэальным волевыяўленні народа, толькі на ласцы сюзерэна. І можа так здарыцца, што портпароль беларускага цэнтрвыбаркама выбярэ загад сюзерэна важнейшага, з цэнтра культавай дзяржавы і заміж яго, Бацькі, аб'явіць пераможцам прэзідэнцкіх выбараў нейкага Дзядзьку. І няма вялікай упэўненасці, што хто-небудзь за родным Бацейкам заступіцца.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Беларускі мастак Вільні

Беларускае таварыства палітвязняў і ссыльных г. Вільні арганізавала ў зале Дома нацыянальных меншасцей выставу прац вядомага віленскага беларускага мастака Уладзіміра Кузьменкі, які памёр пяць гадоў таму.

Уладзімір Міхайлавіч нарадзіўся 13 жніўня 1935 года на Магілёўшчыне. Падчас Другой сусветнай вайны ён разам з маці, сястрой і братам былі вывезены немцамі ў канцэнтрацыйны лагер смерці Майданак, дзе вельмі пакутавалі ад нечалавечых здзекаў, голаду і холаду. Праз некаторы час немцы адправілі іх на прымусовыя працы ў Аўстрыю. Там таксама працягваліся здзекі, пакуты і цяжкая невыносная праца. Але ўжо набліжаўся Другі фронт з Захаду і сям'я Кузьменкі была вызвалена амерыканскімі жаўнерамі. Праз некаторы час яны вярнуліся ў Савецкі Саюз, але не на радзіму, а на Украіну. Там яны пражылі тры гады, адкуль падаліся ў Літву. Уладзімір трапіў у дзіцячы дом у Падброддзе, бо сям'я вельмі бедавала. У Падброддзі Уладзімір кончыў школу і паступіў 18-гадовым юнаком у Мінскае мастацкае вучылішча, бо мастацтва яго цікавіла з дзяцінства. Ён бачыў сябе ў будучым толькі мастаком. Вучылішча закончана ў 1958 годзе, пачалася праца, але, адчуўшы недахоп ведаў, Уладзімір паступае ў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут, які скончыў у 1965 годзе. Зноў працаваў у Беларусі, а потым вярнуўся ў Літву. У Літве Уладзімір Кузьменка раскрыўся як рознапланавы мастак, стаў працаваць у розных жанрах. Яму лёгка даваліся партрэты і краявіды, нацюрморты і замалёўкі з паўсядзённага жыцця. Вельмі шмат увагі Уладзімір аддаваў старой Вільні і яе вакольцам. Сёння толькі ў працах Кузьменкі можна ўбачыць зніклую і знікаючую Вільню. Пісаў мастак алеем, алоўкам, акварэллю. Яго творы эскпанаваліся на шматлікіх мастацкіх выставах у Літве і ў Беларусі ды іншых краінах. Шмат яго твораў сёння знаходзіцца ў музеях і ў прыватных калекцыях у Літве, Беларусі, Швецыі, Расіі, ЗША, Польшчы.

Творы на выставе ў Доме нацыянальных меншацей выстаўлены з прыватных калекцый віленчукоў.

Уладзімір Кузьменка шмат часу аддаваў грамадскаму жыццю, ён афармляў беларускія святы, выступаў на імпрэзах, многа падарожнічаў.

На адкрыцці выставы прыйшлі беларусы Вільні, літоўцы, сябры і знаёмыя мастака, прыехалі са Швецыі знакамітая пісьменніца Інга Лундсквіст — дачка Уладзіміра, сястра.

Выставу адкрыў Валянцін Стэх, выступілі родныя, сябры. Усе адзначалі яго таленты, добрыя чалавечыя рысы, увагу да чалавека. Прысутныя агледзелі выставу і доўга яшчэ ішлі гутаркі каля карцін мастака.

Уладзімір Кузьменка памёр 19 чэрвеня 2005 года і пахаваны на Ліпоўскіх могілках Вільні. Там напярэдадні адкрыцця выставы сябры Віленскага таварыства палітвязняў і ссыльных ускладалі кветкі на яго магілу, прамаўлялі словы пра яго жыццёвы і творчы шлях, пра дзейнасць мастака, а потым усе пайшлі ў Дом нацыянальных меншасцей.

Выстава будзе дзейнічаць увесь кастрычнік.

Павел САЎЧАНКА

Тэкст і фота Міхала МІНЦЭВІЧА

Памяць і прафанацыя

У дзень 1 лістапада жыхары гарадоў, а з нейкага часу і вёсак, наведваюць магілы блізкіх, стаўляюць на іх свежыя кветкі, запальваюць лампадкі і часта прыводзяць святара каб згаварыў кароткую малітву і пасвяціў месца вечнага спачынку. Бывае, што над магілай скажам некалькі слоў у адрас нашых пакойных блізкіх. Многія рэлігіі лічаць, што зямля з'яўляецца базарам, а неба нашым домам. Гэта абазначае, што на зямлю прыходзім на кароткі час, каб зараз вярнуцца назад: пасля смерці чалавек вандруе ў неба, якое з'яўляецца яго сапраўдным домам.

Пачаткаў ушаноўвання памяці памерлых трэба шукаць каля першай чалавечай магілы. Звычай памінаць пакойнікаў цягнецца з дагістарычных часоў і ў розных эпохах набываў розныя формы.

Ля многіх вёсак Падляшша ў лясных гушчарах можна сустрэць адзінокія салдацкія магілы, а на палях курганы — сляды колішніх пахаванняў. На жаль, да гэтых месц цяпер ужо ніхто з лампадкай не прыходзіць. А належыцца ім так нямнога — крышынка людской памяці, крыж або валун; адным словам — патрэбны ім жэст чалавечнасці. Кветкі і знічы, якія ў лістападзе нясем на магілы сваіх блізкіх, гэта знешняе выяўленне памяці жывых аб памерлых. Стоячы ля магіл родных быццам спыняем час і акунаемся ў роздум аб прамінанні. Нярэдка ў гэты дзень без сораму вызваляем на хвіліну схаваную ў глыбі нас чалавечнасць і, разглядаючыся вакол сябе, заўважаем штосьці больш навонкі нас. І тады запальваем свечку на самотнай, запушчанай магіле. Пры нагодзе вучым гэтай рэфлексіі дзяцей, тлумачачы, што там таксама ляжыць чалавек. Падумайма цяпер аб самотных, забытых і занядбаных месцах пахаванняў, раскінутых па ваколіцы, а летам спрабуйма давесці іх да парадку.

Штогод у Орлі ў першую нядзелю пасля Вялікадня адбываецца ўрачыстае шэсце з царквы св. Міхаіла на старое цэрквішча пры вуліцы Бельскай — да магіл расійскіх і нямецкіх салдат, якія загінулі падчас Першай сусветнай вайны. Там, у капліцы св. Сімяона Стоўпніка адпраўляецца паніхіда і малебен за мір у свеце.

Наша зямля ў выніку войнаў прыняла астанкі шматлікіх салдат — сваіх і чужых, вызваліцеляў і захопнікаў. Хаваліх непасрэдна на полі бою. З цягам часу сляды ад іх магіл сцерліся. Заўважыўшы такія месцы варта іх пазначыць і хаця такім чынам ушанаваць памяць аб памерлых.

За вёскай Крывой у Бельскай гміне, з боку Агароднік, у сасновым лесе стаіць абгароджаны драўляным плотам металічны крыж з надпісам, што там спачывае невядомы салдат. Анатоль Краўчук з Крывой расказваў мне, што ў магіле спачываюць астанкі двух чалавек. Адзін з іх — салдат. Зараз пасля вайны людзі капалі яму для захоўвання бульбы і натрапілі на людскія косці. Астанкі былі перанесены ў магілу, у якой у 1944 годзе быў пахаваны салдат. Пакуль у Крывой працавала школа, гэтым месцам апекаваліся вучні, а крыж на магіле невядомага салдата паставіў Анатоль Краўчук.

У наваколлі ёсць яшчэ тры магілы невядомых пакойнікаў. 28 гадоў таму дзеці знайшлі ўпадзінку ў лесе. Людзі пачалі капаць у тым месцы і знайшлі астанкі, аднак толькі з паловай чэрапа. Відаць, салдату выбух разарваў галаву. Пры ім была зброя і ваенны білет, з якога ўдалося прачытаць толькі частку слова: „ант"; невядома, ці быў гэта лейтэнант ці сяржант.

Нехта ляжыць яшчэ ў багне. Дзеці насыпалі там магілу, але ніхто ёю не апекаваўся і з часам след па ёй прапаў. Потым хацелі астанкі перанесці, але не маглі знайсці таго месца.

Пры дарозе ў Вульку-Выганоўскую, непадалёк Рыгораўцаў, стаіць стары нямецкі надмагільны помнік з 1915 года (паставілі яго немцы пасля вайны). Каменны помнік, звенчаны салдацкім шлемам, змяшчае на сабе прозвішчы салдат і нумары рот. Старажылы расказвалі, што загінулі яны ў гэтым месцы ад нечаканай атакі казакаў. Месца гэтае ўжо некалькі разоў парадкавалі і абгароджвалі (сталёвыя агароджы спакушалі зладзеяў), аднак пасля нейкага часу яно паступова зарастае самасейнымі карчамі.

Каля трохсот метраў ад таго ж могільніка знаходзіцца могільнік загінуўшых у той жа час расійскіх салдат (магчыма, што ў тым самым баі). Аставаўся ён па-за ўсякай увагай да 2006 года. Заняўся ім спачатку па уласнай ініцыятыве Аляксандр Крот, шахцёр-пенсіянер з Рыгораўцаў, які, ведаўшы пра добраўпарадкаваныя старыя могілкі на Шлёнску, уласнаручна стаў высякаць кустоўе і адкрываць зарослыя дзёрнам намагільныя пліты. Пазней „абнаўленнем" могільніка занялася фірма з Гайнаўкі, у выніку чаго старыя намагільныя пліты былі сапхнуты навонкі, старыя бетонныя слупкі і агароджа знесены, а заміж іх узведзена малатрывалая драўляная агароджа. З такога абнаўлення могільніка ніхто ў вёсцы задаволены не быў, бо ж не толькі была зменена структура могільніка, але агароджу зрабілі закароткай, прапалі старыя крыжы пры трох афіцэрскіх магілах, пабітыя намагільныя пліты былі сапхнуты навонкі, дзе яны ляжаць і зараз. Сапраўдны выгляд гэтых могілак астаецца толькі ў памяці навакольных жыхароў. Спешка гміны з аднаўленнем могільніка, а ў выніку многія недахопы, былі — паводле Аляксандра Крота — прадыктаваны выбарчай кампаніяй на пасаду войта камісарычнага загадчыка Арлянскай гміны, які хацеў нечым пахваліцца.

Некалькі гадоў да гэтай падзеі падобны помнік быў абноўлены ў суседняй вёсцы Маліннікі. Старыя могільнікі пасля нейкага часу занядбоўваюцца, зарастаюць зеллем і карчамі. Чаму? Як мяркуюць жыхары, на рамонты могілак гміна атрымлівае датацыі, якіх не хапае на пазнейшае іх утрыманне.

На жаль, не ўсе магілы перыяду Першай сусветнай вайны былі ў нас пазначаны і ўшанаваны. Напрыклад, каля Рудутаў, пры самай дарозе ў Дубічы-Царкоўныя, 200 метраў ад вясковых могільніках (на рагу вуліц Польнай і Чырвонай Арміі) захавалася каля пяцідзесяці помнікаў (усім ім я выканаў фатаграфічную дакументацыю), якія нішчэюць на неабгароджанай некраполіі, на якой нехта пасвіць часам кароў, а нехта іншы зрабіў сабе дарогу ў поле.

Побач вёсак можна часам сустрэць некалькі старых крыжоў або каменны помнік. Гэта найчасцей сляды моравых (халерных, тыфозных) могільнікаў, на якіх хавалі памерлых ахвяр эпідэміі. Так было паўтара стагоддзя таму, калі ад заразы памерлі амаль усе жыхары вёскі Вэрвэчкі. Цяпер у ляску каля Орлі (з боку калёніі Антанова) стаіць каменны крыж, які на месцы спарахнелага драўлянага паставіў 12 красавіка 1909 года землеўладальнік Пётр Кубаеўскі. Хаця тая сумная падзея жыве ў грамадскай памяці, прыкра, аднак, што ля крыжа жыхарам неіснуючай вёскі Вэрвэчкі не спраўляюцца малебны, ніхто не наведвае гэтага месца. А знаходзіцца яно ўсяго толькі сто метраў ад прыхадскіх могілак.

У чыстым полі каля Крывятыч, 300 метраў ад шашы ў бок Орлі, захаваўся запалы ў зямлю каменна-металёвы помнік з надпісам. На гэтым месцы ў канцы XIX стагоддзя вяскоўцы хавалі малых дзяцей, якія тады часта ўміралі. Месца пахаванняў сяляне ўжо зааралі і сеюць на ім збожжа. А памяць занікае...

Пры цары ўлады забаранялі хаваць памерлых у выніку эпідэміі нябожчыкаў на могілках, якія знаходзіліся ў цэнтры або побач вёсак. Так было ў Парцаве Бельскай гміны, дзе месца на могільнік вызначылі ў полі каля ста метраў ад дарогі ў Вульку. Там хавалі памерлых да Першай сусветнай вайны. Тады магілы абкладвалі толькі дзёрнам і цяпер ад іх асталіся толькі невялічкія бугаркі. На гэтым могільніку захавалася шмат драўляных і каменных пастаментаў, звенчаных каванымі металічнымі крыжамі. Цяпер мала хто з праязджаючых побач абгароджанага сеткай і парослага хмызам месца здагадваецца, што гэта стары парцаўскі могільнік.

Падляшская зямля крые ў сабе многія месцы, на якіх нашы продкі хавалі сваіх памерлых. Некаторыя з іх ужо даследавалі археолагі і яны занесены ў спісак ахоўваемых законам помнікаў. Аднак ніхто не цікавіцца гэтымі месцамі.

Прафанацыя могільніка

Цяжка ў гэта паверыць, але ў Арлянскай гміне ад звыш дзесяці гадоў здараецца прафанацыя і руйнаванне аднаго са старых могільнікаў. Ганебнае дзеянне адбываецца побач Вулькі-Выганоўскай на незарэгістраваным кар'еры пры дарозе ў Паўлінова на старажытным могільніку, занесеным у спіс археалагічных помнікаў.

Прафанацыя і руйнаванне гэтага могільніка пачаліся ў 1999 годзе, калі войтам быў Міхал Іванчук, а людскія косці сумесна са жвірам паслужылі для пабудовы гравійкі з Круглага ў Дыдулі. Тады гэтая падзея ўзбударажыла мясцовае грамадства (пісаў я пра тое ў „Ніве" ад 27.06.1999 і ў „Газеце Вспулчэснай" ад 11.05.1999 года).

11 мая спецыяліст-археолаг правёў абследаванне разбуранага могільніка; пацвердзіў ён прафанацыю людскіх астанкаў. Паводле археолага, на тэрыторыі кар'ера пакояцца астанкі продкаў жыхароў Вулькі-Выганоўскай. Захавальнік археалагічных помнікаў назваў разбурэнне могільніка неэтычным актам, які вядзе да зацірання слядоў мінуўшчыны. У сувязі з гэтым захавальнік параіў войту перапахаваць астанкі і спыніць здабычу жвіру на старым могільніку. Ліст у гэтай справе атрымалі таксама ваяводскі геолаг і бельскі староста.

Войт, аднак, праігнараваў жывых і мёртвых. 31 мая 1999 года на разбураны могільнік прыехалі дзве камісіі, назначаныя ваяводскім рэстаўратарам помнікаў і археалагічным захавальнікам. Спецыялісты сцвердзілі, што надалей вядзецца здабыча жвіру, а ў раскапаных магілах відаць раструшчаныя землечарпалкай косці. Ваяводскі рэстаўратар у адмысловым лісце паведаміў войта, што мае спыніць здабычу жвіру, якая можа давесці да цалкавітага знішчэння існуючых там яшчэ магіл, і што гмінныя ўлады павінны сарганізаваць пахаванне відочных людскіх астанкаў, упарадкаваць наяўную там дзікую звалку і ўстанавіць табліцы забараняючыя здабываць там жвір і выкідаць туды смецце.

Тадышнія гмінныя ўлады вельмі неахвотна пагадзіліся з некаторымі ўказаннямі рэстаўратара і на нейкі час прафанацыя могільніка спынілася. Пры чарговым войце, Яну Добашу, пакуль у Гміннай радзе была моцная апазіцыя, на часткова ўцалелым могільніку было спакойна.

А як выглядае справа цяпер? Я загляну туды ў мінулым годзе. Від выклікаў жах — свядомая татальная прафанацыя! Дашчэнту зруйнаваны чарговы ўчастак могільніка прапаў разам са жвірам. Выразна відаць, што працавалі там магутныя машыны...

У доле ад выбранай пароды валяліся шматлікія людскія косці (сцегнавыя, пазванковыя, скабавыя, фрагменты таза, чэрапа, сківіц з зубамі). Людскія астанкі валяюцца там да сёння.

Землечарпалка, капаючы жвір на пабудову чарговых дарог адкрыла чарговыя магільныя ямы, з якіх тырчаць косці людскіх шкілетаў, якія паказваюць, што на неразбуранай яшчэ тэтыторыі жвіроўні захаваліся чарговыя магілы. Затое па-суседску разрастаюцца тэрыконы чарговых дзікіх звалак. Такія факты.

Ухабістыя „затокі”

Пацікавіўся я заездамі на аўтобусных прыпынках гарадской камунікацыі ў Беластоку. Найбольш тымі няроўнымі, ухабістымі, а іх у горадзе, дзе маюць установы ваяводскія ўлады, шмат. Калі ў дажджлівы дзень аўтобусы Беластоцкай гарадской камунікацыі (БГК) пад'язджаюць да бардзюраў і тратурараў як мага найбліжэй, тады апырскваюць пасажыраў вадой з ямін на заездзе. Гэтак ёсць на вуліцах і ў цэнтры горада, але і на яго ўскраінах, між іншым па вул. Сянкевіча, Васількоўскай і 27 Ліпеня ды на алеі Пілсудскага.

Сёлета ў ліпені і жніўні некаторыя заезды, г.зв. затокі, рамантавалі. Наглядаў я за такім рамонтам заезду на аўтобусным прыпыну БГК на вул. Сянкевіча, над ракой Белай. Яго загарадзілі, сарвалі брусчатку, г.зв. костку, зрабілі новую падсыпку, расплянтавалі зямлю ды ўтрамбавалі яе на ток, а затым паклалі новую брусчатку. Будавалі заезд больш тыдня. 2 кастрычніка пайшоў дождж і назбіраліся лужы. Аўтобусы аблівалі пасажыраў граззю якраз на згаданым вялікім прыпынку над Белай. Рамонту тут быццам і не было. Вось як яно ёсць! Ці хто правяраў той аўтобусны заезд? Ён такі ж ухабісты, як быў і раней, да рамонту!

Настаўнікі-пенсіянеры на прыродзе

Настаўнікі-пенсіянеры маюць значна больш вольнага часу і могуць яго прысвяціць сабе, на больш „разрыўкі” і на свае хобі, чымсьці тыя, хто яшчэ працуе прафесійна. Сеніёры з Гайнаўкі — людзі актыўныя: часта і вельмі ахвотна выходзяць на прагулкі, на канцэрты ў гарадскі парк або ў Гайнаўскі дом культуры, ездзяць на турыстычна-краязнаўчыя экскурсіі, на адпачынак у курорты.

23 верасня г.г. настаўнікі паехалі на прыроду з нагоды Свята печанай бульбы. Сабралася ля вогнішча і пад спецыяльным дашком-паветкай 25 чалавек. Былі музыка і танцы. А як прыгожа спявалі!

На гэтае мерапрыемства нарыхтавалі шмат смачнай ежы, усялякіх вяндлін і салатак. Былі і печаная бульба ў вогнішчы, але і бульбяная бабка, і кілбаскі.

Імпрэзу арганізавала праўленне секцыі пенсіянераў Гайнаўскага аддзела Саюза польскіх настаўнікаў пад кіраўніцтвам старшыні Ірэны Юрчук.

Прыгожыя пушчанскія дубы

Прыгожыя пушчанскія дубы растуць у лясах Белавежскай пушчы і ў яе наваколлі. Сваёй спакойнай прысутнасцю цешаць нас дубы ў Старой Белавежы. Шматвяковыя волаты знаходзяцца на тэрыторыі Гайнаўскай гміны, між іншым, каля вёсак Лазіцы, Ліпіны, Пасталова і Пераходы ды ў Нарваўскай гміне — каля Падваскоў і Прыбудак.

Стройныя дубы сустрэнем на тэрыторыі Нараўчанскай гміны. Дубовыя гаі цешаць вока ў Свінароях каля Нараўкі, каля Крыніцы, Капітаншчыны і ў Гнільцы, а таксама там, дзе прытокі ракі Нараўкі — Гозьна і Брашча — уліваюцца ў Нараўку. Паасобныя векавыя дубы растуць у Плянце.

Дрэвы гэтага шляхетнага гатунку ліставых можна ўбачыць у Гайнаўцы па вул. Белавежскай, Паркавай, Арміі Краёвай, а. Дзевятоўскага і Пілсудскага. **(яц)**

Кірунак на супрацоўніцтва

Прадстаўнічая дэлегацыя з-за Буга, складзеная з мэраў польскіх гарадоў (бурмістраў) і старшынь сельсаветаў (войтаў) Падляшскага ваяводства гасціла на Брэстчыне.

10-12 верасня яны азнаёміліся з інфраструктурай Камянецкага раёна, у тым ліку з ААТ «Відамлянскае», рэспубліканскім санаторыем «Прыазёрны», школай мастацтваў і спартыўным комплексам у Камянцы. Наведалі касцёл святых Пятра і Паўла, Свята-Сімяонаўскую царкву, музей «Камянецкая вежа». У Каменюках госці пабывалі ў сярэдняй экалагічнай школе, у музеі прыроды і доме рамёстваў, здзейснілі экскурсію па Белавежскай пушчы.

http://picasaweb.google.com

Камянецкая Вежа

У райвыканкаме адбылася сустрэча са старшыней раённага выканаўчага камітэта Андрэем Пісарыкам. Гутарка датычылася сацыяльна-эканамічных аспектаў развіцця вёсак і невялікіх гарадоў, наладжвання супрацоўніцтва. Зянон Бялабжэскі, які ўжо 30 гадоў узначальвае гміну Збуйна ў Ломжынскім павеце, зазначыў, што яго і калег цікавяць спосабы водазабеспячэння населеных пунктаў, утылізацыі бытавых адходаў, ачышчэння сцёкавых водаў; не меншая зацікаўленасць была і да такіх праблем, як забеспячэнне грамадзян жыллём і ўтрыманне дарог у добрым стане. Прадстаўнікі мясцовай улады Падляшскага ваяводства атрымалі адказы на ўсе пытанні, якія іх цікавілі.

Як расказалі прадстаўнікі польскай дэлегацыі, яны прыехалі, каб наладзіць як мага больш кантактаў. Зянон Бялабжэскі адзначыў, што суседзяў не павінны раз'ядноўваць граніцы. І тут велізарны патэнцыял бачыцца ў праекце малога прыгранічнага руху, калі беларусы і палякі, якія па абодвух баках граніцы жывуць у зоне 30 км, змогуць перасякаць яе без візы.

Госці адзначылі, што перасяклі граніцу Еўрасаюза і не ўбачылі практычна ніякай розніцы, трапіўшы ў прыгожую краіну. Іх проста здзівілі тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі, а пабыўшы ў аграгарадку Відамля, палякі прыйшлі ў захапленне. Яны не скрывалі, што ў беларусаў ёсць чаму павучыцца.

— Хоць летась і быў на Брэстчыне, — зазначыў прадстаўнік праўлення Саюза сельскіх гмін Падляшскага ваяводства Зянон Бялабжэскі, — але зноў адкрыў для сябе нямала новага. У Відамлі ўразілі высокія тэхналогіі ў сельскай гаспадарцы, дагледжаныя палеткі, чысціня абапал дарог і самі дарогі, рамонт і ўтрыманне якіх у нас, у гміне, таксама стаіць на першым плане. А гміна Збуйна — гэта амаль 5 тысяч жыхароў, і вельмі хацелі б, каб і ў нас была магчымасць надаваць столькі ўвагі фізічнай культуры, мець такія ж збудаванні для спартыўных заняткаў. У школах бачылі, у якой любові да айчыны выхоўваюцца вашы дзеці на прыкладах традыцый, культуры і гісторыі... Спадзяюся, што больш актыўным стане ўзаемны абмен дэлегацыямі моладзі і падлеткаў, што яны больш даведаюцца аб інтарэсах і захапленнях сваіх равеснікаў за мяжой, будуць вучыцца жыць таксама ў добрасуседстве.

Таксама прывабна актывізацыя кантактаў у плане фінансавага ўзаемадзеяння ў рэжыме еўрасуседства. Як паведаміў бурмістр Саколкі Станіслаў Малахвей, зараз рэалізуецца праект у Польшы, Расіі і Літве, накіраваны на развіццё аднаўляльных крыніц энергіі, напрыклад, сонца і ветру, і падключэння да іх сістэм асвятлення і ацяплення сельскіх гаспадарак. На аналагічны трансгранічны польска-беларуска-ўкраінскі праект Еўрасаюз гатоў выдзеліць да 4 млн. еўра, пры гэтым пачатковы ўклад краін-партнёраў мусіць складсці ўсяго 10%. Для запуску гэтай перспектыўнай праграмы, якая нясе не толькі бонусы ў энергазберажэнні, але і ў будаўніцтве адпаведнай інфраструктуры, польскі бок шукае беларускіх і ўкраінскіх партнёраў.

З адкрыццём малога прыгранічнага руху па-новаму зайграюць такія праекты, як абмен моладдзю і студэнтамі, розныя міжкультурныя праграмы. Напрыклад, у музычнай школе ў Камянцы прадстаўнікам суседняй краіны настолькі спадабаўся канцэрт, што госці запрасілі музыкантаў да супрацоўніцтва пры арганізацыі сумесных выступленняў з польскімі артыстамі такіх жа навучальных устаноў Польшчы. Вельмі перспектыўным выглядае супрацоўніцтва паміж мясцовымі структурамі самакіравання прыгранічных рэгіёнаў. Прамыя кантакты без пасрэднікаў вырашаюць многія пытанні выгаднага ўзаемадзеяння, не трацячы лішніх сіл і часу.

Госці з-за Буга таксама пабывалі і ў абласным цэнтры. Асабліва ўразіла палякаў экскурсія ў мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць», грандыёзная і патрыятычная вартасць якога падкрэслівае, як трапятліва ў нашай краіне адносяцца да гісторыі. Адзін з гасцей адзначыў, што ў таго, хто не ведае сваёй гісторыі, няма будучага, таму бачачы такія помнікі, можна смела сказаць: з такімі суседзямі як беларусы патрэбна сябраваць і супрацоўнічаць.

Людміла ДУДАР
старшыня Камянецкага раённага культурна-адукацыйнага аб'яднання «Спадчына»

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

У Калінінградзе

У Расіі маем дэмаграфічны крызіс. Пра гэта заявіў на VIII Агульнарасійскім форуме „Стратэгічнае планаванне ў рэгіёнах і гарадах Расіі”, які адбыўся 20 кастрычніка 2009 года ў Санкт-Пецярбургу, міністр фінансаў Расійскай федэрацыі Аляксей Кудрын; прадбачваецца, што крызіс працягнецца пятнаццаць гадоў. У той час лік старэйшага насельніцтва будзе ўзрастаць, а лік маладых людзей меншаць. Улады Расіі разлічваюць на палагоджанне абставін шляхам рэалізацыі дабравольнага перасялення расіян з далейшага і бліжэйшага замежжа. Ёсць апрацаваныя праекты, у тым ліку і ў Калінінградскай вобласці, у якіх прадугледжваюцца меры па прыёме перасяленцаў, у тым ліку іх бытавое забеспячэнне і аплату коштаў самога перасялення. Напрыклад, для перавозу асабістай маёмасці сям'я да трох асоб атрымае 5-тонны кантэйнер, большая сям'я — 10-тонны. Перасяленцам неабавязкова прымаць расійскае грамадзянства.

Паводле інфармацыі былога губернатара Калінінградскай вобласці Георгія Бооса, узнікне тут шэраг асяродкаў часовага прабывання (да двух гадоў) для рэпатрыянтаў. Неўзабаве такі асяродак для сямісот асоб будзе адкрыты ў Азёрску, бо існуючы асяродак у Северным ужо перапоўнены. Мясцовыя ўлады прадбачваюць арганізацыю каля дзесяці такіх асяродкаў у былых казармах дзеля сумарнага прыёму каля трохсот тысяч асоб, у першую чаргу з Казахстана, Кіргізстана, Украіны, Таджыкістана, Малдовы і Беларусі; прыехала таксама каля сотні асоб з Латвіі і 48 з Літвы, а ўсяго ў Калінінградскую вобласць перасяліліся людзі з дваццаці шасці дзяржаў.

Бібліятэкі — юбілеі на абодвух баках мяжы

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

Злева: Юрка Голуб і Ян Леанчук

Найстарэйшая публічная бібліятэка Беларусі з нагоды 180-годдзя сабрала ў Гродне навукоўцаў з розных краін. 16 жніўня ў Абласной навуковай бібліятэцы імя Яўхіма Карскага праводзілася міжнародная навукова-практычная канферэнцыя „Публічная бібліятэка ў кантэксце грамадска-культурнай прасторы рэгіёна — два стагоддзі гісторыі". Узялі ў ёй удзел гісторыкі і філолагі з Гродна ды навукоўцы і прадстаўнікі бібліятэчных сістэм з Польшчы і Расіі. У Гродна прыехаў таксама праўнук Яўхіма Карскага — пісьменнік з Пецярбурга Аляксандр Карскі. Прадставіў ён невядомую шырокай публіцы інфармацыю з жыцця свайго прадзеда — ураджэнца Гродзеншчыны, вядомага этнографа, стваральніка беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства. У юбілеі ўдзельнічаў таксама Ян Ленчук — дырэктар Ваяводскай публічнай бібліятэкі імя Лукаша Гурніцкага ў Беластоку — „Падляшскай ксёнжніцы", якая сёлета адзначае сваё стагоддзе. Ян Леанчук — адзіны з усіх выступоўцаў, які на мерапрыемстве прамаўляў па-беларуску:

— Эканамічны разлік шораз часцей спіхвае на абочыну выдавецкую дзейнасць, а яна вядзе да таго, што кніжка становіцца таварам раскошы. Тым большага значэння набірае роля бібліятэк, каб пазбягаць гэтым некарысным напрамкам і заняпаду. Бібліятэкі, бывае, ідуць у напрамку інтэрнэт-кафеек, абяцаючых інфармацыю, як вядома, не заўсёды каштоўную, неаднойчы паддаваную маніпуляцыйным дзеянням. Тады бібліятэкі страчваюць чытачоў, а здабываюць часовых карыстальнікаў інтэрнэтных медыяў. А тыя паглынаюць галоўным чынам газетныя навінкі. Шораз часцей кніжка прэзентаваная ў інтэрнэце знаходзіць сваіх карыстальнікаў, асабліва кніга старадаўняя, рэдкая і цяжкадаступная ў бібліятэчных фондах. Дыгіталізаваная і ўведзеная на бібліятэчныя сайты дазваляе без большых абмежаванняў карыстацца ёю. А паколькі спалучае нас шмат, між іншым гісторыя з Вялікім Княствам Літоўскім, думаю, што нашым супольным заданнем з'яўляецца паказванне (што, дарэчы, ужо адбываецца) багатай гісторыі і сувязей сяброўства, няраз анімозіяў, але і супольнага перажывання. І ненайважнейшыя ў гэтым заданні адрозненні, якія вынікаюць з пункту гледжання паасобных гістарычных падзей, але і нашая воля пазнавання і зразумення існуючых адрозненняў. Бібліятэкі па абодвух баках мяжы, напоўненыя здабыткамі чалавечых думак, з'яўляюцца неад'емным багаццем узаемнага спазнавання і пошукаў супольнасці. У беластоцкай бібліятэцы, якая даручаная маёй апецы, безупынна папаўняем зборы на беларускія і літоўскія выданні (галоўным чынам датычныя гісторыі і шырокага абсягу гуманістыкі). Гэтыя зборы дазваляюць зразумець, не толькі даследчыку гістарычнай ці сацыялагічнай праблематыкі, якімі няраз цяжкімі з'яўляюцца працэсы інтэлектуальнай інтэграцыі, але і наступаючы змены ў даследаваннях над нашай супольнай мінуўшчынай. Ды збіранне матэрыялаў выдаваных па-за межамі Польшчы натыкаецца на цяжкасці, галоўным чынам эканамічнага характару. Адтуль аграмадная роля бібліятэк, якія дзейнічаюць у суседстве, але раздзеленыя поясам незааранай зямлі, якой плён заўсёды будзе сумніўным. Абмен паміж бібліятэкамі быў бы пажаданым — абмен дублетамі і кніжкамі, расшукванымі нашымі чытачамі. Па абодвух баках мяжы ёсць у нас чытачы беларуска- і польскамоўныя. Ідучы далей, маглі б мы супольна шукаць фінансавання, падаючы супольныя праекты. Марыцца мне здаўна такое: каб бібліятэкі па абодвух баках мяжы ўзбагаціць „моўнай кніжкай", прызначанай інвалідам, для якіх зрокавае чытанне ўжо немагчымае, аўдыёкніжкай прэзентаванай прынамсі на трох мовах: беларускай, польскай, рускай і магчыма што англійскай (э-букі). Тут скрываюцца агромныя магчымасці азнаямлення і прадстаўляння каштоўнасцей, на пачатак літаратурных, якія ствараюцца па абодвух баках мяжы, і якія для абодвух партнёраў амаль невядомыя. Балючае расчараванне адчуў я ў час падрыхтоўкі анталогіі паэтаў Гродзеншчыны і Беласточчыны „Гнёзды слоў". Аказалася, што гэта першая такога тыпу спроба па абодвух баках памежнай паласы. Некаторых паэтаў прэзентавала „Ніва", ды польскамоўны чытач быў пазбаўлены і ведаў, і паэтычных хваляванняў. Суседзі з другога боку Кузніцы-Беластоцкай станавіліся шораз больш невядомымі. Культурная ізаляцыя паглыблялася з году ў год і я думаю, што пара ўжо спыніць гэтую нездаровую для абодвух бакоў сітуацыю. На бібліятэках па абодвух баках мяжы будзе ляжаць патрэба пошукаў добрага суседства... Некалькі дзён таму вандраваў я па польскім баку мяжы, абязлюдзелым ужо ад гадоў, з вяртаючыміся толькі летам асаднікамі, і змярцвеласць ды нейкая трывожная пустэча з'яўляліся мне перад вачыма, чым я больш набліжаўся да мяжы. Я падумаў тады аб літаратуры, апісваючай самоту, аб усялякіх межах, не толькі дзяржаўных, раздзяляючых людзей. Я далёкі ад палітыкі, абараняю бібліятэку ад палітызаванасці, гэта ж асаблівае месца. Беластоцкая „Ксёнжніца" мае ўжо мільённы кнігазбор і гэта значны высілак некалькіх пакаленняў бібліятэкараў, якія пасля ваенных пажарышч, дастаючы з развалін некалькі соцень кніг, будавалі аснову найбольшай публічнай бібліятэкі на ўсход ад Вісла. Юбілеі нашых бібліятэк: 180-годдзе гродзенскай бібліятэкі імя Карскага і 100-годдзе беластоцкай імя Гурніцкага забавязвае да бліжэйшых штодзённых кантактаў. Можа гэта быць наша юбілейнае абавязацельства. Шмат матэрыялаў датычных Гродна і ваколіц, мясцовасцей Рэспублікі Беларусь маецца ў польскіх бібліятэках і архівах. Бліжэйшае супрацоўніцтва дазваляла б на штодзённую, добрасуседскую дапамогу ў папаўнянні фондаў. Міжбібліятэчныя пазыкі дзейнічаюць ад шмат гадоў, ды эканамічны фактар не заўсёды спрыяе гэтаму абмену. Сканіраванне і электранічны шлях могуць быць часовым фактарам падтрымліваючым чытальніцтва і даследчыцкія працэсы.

Беластоцкая „Ксёнжніца" за апошнія гады пільна сочыць за выдавецкай дзейнасцю на беларускай мове. У адмысловым зборы рэгіяналій маюцца тут усе выданні беларускіх аўтараў Беласточчыны.

Па грыбы...

Сёлетняя спёка, якая доўжылася да паловы жніўня, не прадказвала аптымістычна глядзець на тое, што будзем збіраць грыбочкі. Але спасаўскія дажджы і цёплыя ночы перамянілі гэты прагноз. Я абяцаў ніўскім сябрам-журналістам, што яшчэ пакаштуем сёлетніх зялёнак ды падгрыбкоў (махавікоў), у якія багатыя навакольныя лясы чаромхаўскага навакольля. І мае спадзяванні здзейсніліся. Праўда, баравікоў паявілася шмат у лісцевых лясах (дубіна, бярэзіна), але і ў сасновым лесе можна знайсці такія экземпляры, як гэты на здымку. Па белыя грыбы (праўдзіўкі) найбольш едуць у рэпчыцкія кар'еры ды сумежныя „Гарылі", што за кузаўскім віядукам. Але грыбнікам сапраўднае задавальненне прыносіць збіранне махавікоў. Столькі іх сёлета паказалася, што хоць касою касі! На скупцы за кілаграм гэтых грыбочкаў пачаткова плацілі па 3 і 4 зл. Потым скупшчыкі панізілі цану на залатоўку. Навінкай стала, што прадпрымальнікі-грыбнікі пачалі купляць „краянку" (парэзаныя ў кубікі шапкі) і плацяць па 3 зл. за кілаграм. Аматараў на такі бізнес у Чаромхаўскай гміне хоць адбаўляй. Некаторыя „абарачаюць" па два курсы ўдзень і зарабляюць па некалькі дзесятак злотых. А я сушу грыбы ў прыспасобленай сушылцы, якую зрабіў пячнік, сардэчны прыяцель Ян Бадавец з Кляшчэляў і раблю марынады на зімовыя сцюжы. Ды сябрам на пачастунак як яны прыдаюцца! Калісьці пакойныя бацькі мне казалі: „Што летам нагою, дык зімою рукою". Дык не трацьма часу — ідзем па грыбы!

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Па грыбы са смеццем

Як штогод, так і сёлета пачалі высыпацца грыбы ў лесе. Шмат беластачан, ураджэнцаў нашых вёсак, на сваіх аўтамашынах штодзённа едуць па грыбы. Вядома, як прыемна ў пагоду пахадзіць па лесе, падыхаць чыстым паветрам, назбіраць грыбоў, а пры нагодзе наведаць сваіх бацькоў або дзядуляў у вёсцы.

Найгоршая бяда, што здараецца так: тыя грыбнікі вязуць з Беластока рознае смецце і выкідваюць яго ў прыдарожных равах або ў лесе! Лясныя службы не маюць столькі працаўнікоў, каб сачыць за кожным грыбнікам ці той не парушыў парадку ў лесе. Мне здаецца, што смецце вывозяць не жыхары блёкаў, а якраз уласнікі катэджаў, якім не хочацца плаціць прадпрыемству ачышчання горада за вываз нечыстотаў. Бывае, што грыбнікі на сваіх машынах вязуць на экскурсію і сваіх сабак. Некаторыя нават вывозяць былых улюбёнцаў ці нядужых ужо старых цюцек! Колькі пасля бегае галодных і шнырыць па вёсцы былых верных стражнікаў і пестуноў. І ў жывёлы ж свая душа! Завялі б іх у прытулак, тады сабакі мелі б шанц знайсці новага гаспадара і годнае жыццё!

З пашанай да вас, грыбнікі!

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

зорка
для дзяцей і моладзі

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

Гэта наша песня!

Фота Ганны Кандрацюк

— Вось, у пачатку кніжкі мы маем верш пра „Арлы з Орлі”, — пачала паэтка Міра Лукша...

— Але іх ужо няма, яны кудысьці адляцелі! — адказаў Мацейка Ціслюлька.

Хлопчык ведае ўсё, што дзеецца ў Орлі. Чаму? Бо там жыве яго бабуля. (Мацек вядомы таксама як выканаўца песні-шэдэўра *Цік-так ходзікі*).

Так выглядала размова дашкольнікаў з аўтаркай кніжкі „Жывінкі з глыбінкі”. Пад уплывам вершаў дзеткі гаварылі адкуль родам іх бабулі і дзядулі, расказалі чый бацька баіцца лётаць самалётам і ў каго сваякі ў Беларусі. Але найпрыгажэйшы сюрпрыз чакаў аўтарку „Жывінак” на пачатку сустрэчы. Як вядома, Міра Лукша напісала шмат вершаў пра катоў. І калі яна пачала чытаць верш „Кот Мікіта”, дзеткі заявілі вясёлым хорам:

— Гэта наша песня!

Песеньку, вядома, заспявалі. У садку ведаюць таксама верш пра тое як *захварэў мой бедны коцік*.

— Гэта песня Касі Якімюк! — адказалі хорам.

Настаўніца Альжбета Баравік, якая вяла сустрэчу, не хавала задавальнення: цяпер усе будуць ведаць, што іхнія песні напісала знаёмая паэтка з Беластока, што яна была ў нашым садку, падпісвала свае вершы.

Аўтарка „Жывінак з глыбінкі” таксама не хавала задавальнення:

— Гэта такая прыемнасць і радасць, калі чуеш, што твой твор дзеці называюць сваёй песняй!

Дзеці з беларускага садка ў Беластоку падарылі госцю ружу і свае два прыгожыя кампакт-дыскі пад адным загалоўкам *„Вясёлка” – мы спяваем і танцуем*.

Сустрэча пачалася ў абед, 12 кастрычніка. За акном сонечнымі прамянямі ўсміхалася нам каляровая восень.

ЗОРКА

Фота Ганны Кандрацюк

Са злымі духамі няма жартаў!

(казка народаў афрыканскага ўсходняга ўзбярэжжа, якія камунікуюць на мове суахілі — kiswahili)

Аднойчы малая дзяўчынка пайшла на пляж збіраць ракавіны. Яе прыкмеціў злы дух Зімві. Ён ухапіў малую і схаваў яе ў свой інструмент — бубен. Дэман хадзіў па вёсках і прымушаў дзіця спяваць, а людзі яго добра кармілі і паілі. Злы дух ніколі не даваў яды для дзяўчынкі, што спявала ў сярэдзіне яго інструмента. Аднойчы Зімві зайшоў у вёску дзіцяці. Бацькі адразу распазналі голас дачкі. Яны спаілі злога, адкрылі жывот бубна і асвабадзілі дзіця. Замест яе ўсярэдзіну ўпусцілі пчол, вужа і тэрмітаў. Злы дух праспаўся і не здагадаўся пра замену. Ён пайшоў у другую вёску, дзе зноў загадаў спяваць. Але бубны маўчалі. Угнеўлены дух адкрыў сярэдзіну інструмента. Тут чакала яго прыкрая сустрэча. Яго пакусалі пчолы і тэрміты, уджаліў ядавіты вуж. Зімві сканаў! Аднак не да канца...

На месцы, дзе сканчаў злы дух, выросла дрэва тыква. Людзі баяліся гэтага месца, асабліва дзеці. Калі хтось набліжаўся да дрэва, яно ажывала і жыўцом праглынала малеч. Аднойчы тут забаўлялася двух хлапчукоў. Тыква спачатку маніла іх да сябе, а калі дзеці сталі ўцякаць, яна кінулася ў пагоню. Добра, што ля ракі хлопцы ўбачылі чалавека на пароме. Яны папрасілі ў яго дапамогі.

— Сядайце! — выгукнуў стары. — Толькі хуценька. Са злымі духамі няма жартаў!

Дзякуючы дапамозе незнаёмага, хлопцы паспелі ўцячы ў сваю вёску. Яны схаваліся ў хату і калаціліся ад страху. Вядома, іх следам прыгналася і крыважэрная тыква. Але тут выйшлі малайцы, спынілі дрэва, парубалі на палены і спалілі яго ў вогнішчы.

Людзі, якія жывуць на ўсходнім узбярэжжы Афрыкі вераць, што злы дух жывы. Ён далей жыве як дрэва-тыква ды праглынае дзяцей, якія без мэты шлындаюцца далёка па-за межамі сваёй вёскі.

ЗОРКА

* Суахілі (kiswahili) — мова жыхароў афрыканскага ўсходняга ўзбярэжжа. Суахілі карыстаецца 50 мільёнаў людзей у Кеніі, Танзаніі, Конга, Угандзе. Варта дадаць, што на мове суахілі называюцца ўсе героі культавага фільма „Кароль Леў” (Сімба — значыць леў). Гэтай мовай карыстаецца таксама літаратурны герой Калі ў рамане Генрыка Сянкевіча „У пустыні і ў пушчы”.

Галерэя ЗОРКІ

Фота Ганны Кандрацюк

1. Імя і прозвішча: Кася Якімюк (Польска-беларускае прадшколле № 14 у Беластоку).

2. Твой любімы прадмет: англійская мова, урокі гульні ў шахматы, музычныя заняткі.

3. У жыцці хачу стаць: мастачкай і танцоркай.

4. У сяброў цаню: дабрыню.

5. Не люблю: бітлівых дзяцей.

6. Па-беларуску размаўляю: па-свойму размаўляю з мамай і татам, сятрой і братам, а на літаратурнай беларускай мове — з настаўніцамі ў садку.

7. Кніжка якая мяне захапіла: падручнік па англійскай мове.

8. Падабаецца мне музыка: люблю балетную (класічную) музыку.

9. Твае ўлюбёныя стравы: трускалкі, бульба, *схабовы* (адбіўныя катлеткі).

10. Ці ёсць у цябе любімы спосаб на адпачынак? Так, я люблю паляжаць на канапе.

11. Калі дарасту, хачу быць? Яшчэ не ведаю.

Дарога, школа, дом

Ася Раманюк (першая злева) і яе сябры

Амаль усе вучні са школы ў Новым Корніне праводзяць цэлы дзень у школе або ў дарозе.

— Прачынаюся ў шэсць гадзін раніцы, — кажа дзесяцігадовая Ася Раманюк са Старога Беразова.

Ці хочацца ёй яшчэ паспаць? Найгорш зімой, бо тады яшчэ цёмна за акном. У 6.45 у Старое Беразова пад'язджае школьны аўтобус. З вёскі даязджае шасцёра дзяцей. Гэта многа, калі параўнаць да іншых мясцовасцей. Напрыклад, з Новага Корніна, дзе знаходзіцца іх школа, толькі двое вучняў.

— А дзе прапаў товай сняданак? — пытаем.

— Бяру з сабой. Мама выпраўляе мяне з *канапкамі* (бутэрбродамі).

Яшчэ да таго як пачнуцца ўрокі многія дзеткі з'ядуць падрыхтаваны ў хаце сняданак. Пасля ўрокі і вясёлыя гульні на перапынках. Ася любіць сваю школу і настаўнікаў. І тое, што чацвёрты клас займаецца разам з пятым. Бо гэта значыць адно — больш сяброў!

А палове дванаццатай усе ідуць на абед. У сталовай заўсёды чакае якісьці сюрпрыз.

Пасля ўрокі, гульні ў святліцы і візіт у бібліятэку...

Найгорш, калі дзень цягнецца без канца. Тады ўсе выглядаюць аўтобуса, які завязе іх дахаты. Аўтобус падаюць ажно ў 14 гадзін 25 хвілін. Нічога, што ад школы ў іх вёску няма і дзесяці кіламетраў. Па дарозе трэба развезці яшчэ дзяцей з Чыжык, Хітрай, Дубіч-Асочных... Калі вернуцца ў Старое Беразова, на гадзінніку будзе ўжо палова чацвёртай. Зімой у такую пару ўжо цёмна.

— Першыя трыццаць хвілін я адпачываю з дарогі, — кажа Ася.

— Як, канкрэтна? — пытаем у сімпатычнай дзяўчынкі.

— Ну, гуляю на камп'ютары або чытаю кніжкі.

Пасля адпачынку чацвёртакласніца рашае ўрокі. Ёй хочацца як найхутчэй справіцца са школьнымі абавязкамі. Чаму?

— Бо пасля гуляю з сястрычкай Зосяй. Ёй два годзікі.

У сямейцы Асі аж пяць жанчын. У яе яшчэ мама, старэйшая сястра Аня (студэнтка біямедыцынскай інжынерыі; у школьныя гады яна таксама сябравала з „Зоркай"), і бабуля, якая ўсё ведае.

— Бабуля расказвае мне як калісь жылі людзі, — паяясняе Ася. — Яна таксама кажа мне калі выпадае нашае свята.

ЗОРКА

Вершы Міры ЛУКШЫ

Соня

Наша Соня спаць не хоча,
і капрызіць, і віргае.
Соня спаць не хоча ноччу,
і ў садочку ўсё гуляе.
Што прысніцца маё Соні,
каб схацелася ёй сніцца?
Можа, увесь ружовы поні,
у якога свае крыльцы?
Сядзе ў сне на яго Соня,
паляцяць у край без ночы...
Каб такі цудоўны конік
Заляцеў у наш садочак!

Музыка з кайфам

Хто стаіць за „Тузінам гітоў"

Праходзіць якраз 137-ы тур гіт-парада. У ім за прызнанне слухачоў змагаецца дванаццаць музычных прапаноў. Дэбютанты, старыя „добравядомыя", рокмены, эстраднікі, барды. Сем гадоў працуе ўжо партал „Тузін гітоў" (http://music.from-by.net)! Сярод яго стваральнікаў — Сяргей Будкін, які да сёння працуе кіраўніком і выступае тварам партала.

— **Ці сёлета ўдалося неяк адзначыць чарговую гадавіну?**

— Кожны год стараліся, але ў гэтым, на жаль, пакуль не давялося наладзіць нейкай гадавіны. Складана было фармальна забяспечыць месца правядзення планаванага канцэрта, таму адтэрміноўваем мерапрыемства на будучыню, але напэўна яно адбудзецца.

— **Можна сказаць, што партал стварала трох мушкецёраў, але ўсё ж такі Ты найбольш увагі прысвячаеш „Тузіну".**

— Разам са мной Вецер Механічны і Аляксей Мінчонак, але кожны да сёння мае свой нейкі ўклад. Вядома, у кожнага свае абавязкі, таму дапамагае столькі, колькі зможа, бо ўвесь час гэта грамадская праца.

— **Нягледзячы на шматлікія абавязкі, плануеце развіццё і змену партала.**

— Вядома, трэба ісці наперад. Аднак, як заўсёды, не хапае сродкаў, таму змены цэлы час наперадзе, у апрацоўцы. Як звычайна ў такіх выпадках, шукаем спонсараў, бо хочам, каб наш сайт быў больш мультымедыйны. Калі пачыналі, не было яшчэ Youtube, а цяпер разам з ім стандарты і патрабаванні карыстальнікаў мяняюцца. Галерэі здымкаў ужо не хапае.

— **За дапамогу ў пачатках дзейнасці дзякуеце на сайце, між іншым, фатографу Андрэю Лянкевічу. У чым ён быў неабходны?**

— Менавіта дзякуючы яму мы маглі стварыць першую галерэю здымкаў. Ён працаваў тады ў „Нашай Ніве" і ўвесь час быў блізка культурных падзей у Беларусі. Пасля вырашылі, што асобная галерэя непатрэбная, а зараз ужо рыхтуемся да радыкальных змен.

— **Ці дзякуючы парталу нейкія беларускія выканаўцы маглі здабыць сапраўды шырокую папулярнасць?**

— Шмат такіх выканаўцаў. У першай хвіліне магу ўзгадаць „IQ48", якія з намі ад пачатку сваёй дзейнасці.

— **Зараз музычны змест вельмі адрозніваецца ад таго, што было ў пачатках.**

— Вырашылі прэзентаваць музыку розных жанраў, ад рока праз электроніку па беларускую эстраду. Вынікі зацікаўлення нашых карыстальнікаў паказваюць, што яны аднак прафіляваныя, перш за ўсё цікавяцца альтэрнатывай. Нашая галоўная мэта — прэзентаваць музыку на беларускай мове, таму, калі пашыраецца круг выканаўцаў у іншай стылістыцы, мы павінны і гэтым цікавіцца.

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 43

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 39:

Фазан, камора, тон, кант, спадар, парк, пошта, рак, як, кіт, арка. Лік, як, тата, спорт, фон, паша, ар, картка, загадка, на, як, не, тройка. Узнагароды, аўтаручкі, выйгралі **Рафал Вакулюк** з Арэшкава і **Ангеліка Садоўская** з Беластока. Віншуем!



Вершы

Анатоль ПАРЭМБСКІ

Захаваць свае прыметы

Зіма пройдзе, прыйдзе лета...
Дзеецца ад векаў гэтак.
Дарастаем і старэем.
Вецер нас кругом абвее,
Болей у вочы, менш да згоды...
Усякія ў нас прыгоды.
Каб сабраць іх — будзе кніжка!
Успомніцца Дзям'ян і Мішка,
І Надзейка Сінявока...
Колькі ран у душы глыбокіх
І ад ворагаў, і блізкіх...
І да сёння ў сэрцы блізны.
Ад маленства аж па старасць,
Не за часта была радасць.
Цыганом малых страшылі,
У школе ў лапу вучняў білі.
Войны бралі татаў дзеткам.
Жалі на чужых палетках.
Дараслі, было нялёгка
Выбіцца ў свет шырокі.
Мовай і культурай можам
Разіць вока ў вяльможаў.
Колькі ж пражылі няволяў
І з-за волі, і з няволі.
Акупанты з усіх бокаў.
Каб датрымаць свету кроку,
Прабіваемся як можам.
З бояззю і асцярожна.
За акном шарэе восень
Вецер дзікі як заўсёды
І нагнаў да нас з заходу
Нам не знаны стыль і моду.
І таму, каб быць сабою,
Захаваць свае прыметы,
Цэлым родам заспяваем
„Люблю свой край, старонку гэту!"

Краіна няволяў

Краіна вяковых няволяў,
А так яе любім чамусь,
Бо тут мае шчасце, нядоля.
Ты родная мне — Беларусь!
Саюзы розных калёраў
Карысці табе не далі.
Вырывалі ў цябе па кавалку
Твае радавітай зямлі.
Ворагі ўсякіх адценняў
Не ўспелі цябе задушыць.
Хочацца сёння мне толькі
Зямлі беларускай служыць.
А продкам сваім непакорным
Удзячны я сэрцам, душой
За сатварэнне ў няволі
Спадчыны мудрай такой.
Ад Еўфрасінні Палоцкай,
Ад хрысціянскіх святынь
Да партызанскіх магілаў
Вялікай Айчыннай вайны.
А сёння пакіньма ўсе споры,
Пагоня ці крыж ці звязда,
Уся Беларусаў дыяспора
Да працы, для свайго дабра.

Табе тысячу лет

Беларусь, Беларусь, табе тысячу лет.
Сёння ты ажыла. Хай пазнае ўвесь свет.
Паланілі цябе палякі, русакі,
А пакончыць з табой мелі бальшавікі.
Колькі здзекаў, нягод ты ў вяках пражыла,
А свае ты душы злыдням не аддала.
Уніяцкі падкоп тваю веру таптаў,
А расійскі мацар на Сібір высылаў.
А магіл не злічыць тваіх верных сыноў,
Тут не кончылі біць, пачыналі там зноў.
І тым болей цяпер я табой ганарусь,
Што мы верны сабе: я і ты, Беларусь.



Фота Мірыч ЛУКША

Зараз адчуваю сябе свабодным

*Інтэрв'ю з **Анатолем Парэмбскім** — беларускім народным паэтам з Валілаў-Станцыі, аўтарам двух зборнікаў паэзіі „Хвалі лёсу" (2008) і „Мы тут былі і будзям" (2010).*

Юрка Буйнюк: — ***Спадар Анатоль, крыху Вашай жыццёвай біяграфіі...***

Анатоль Парэмбскі: — Нарадзіўся я 25 снежня 1927 года ў вёсцы Страшава ў гміне Гарадок на Беласточчыне. У дакументах запісалі, што 23 снежня. Чаму так атрымалася? Таму, што пасля першай сусветнай вайны праваслаўныя святары не мелі арыгінальных метрычных кніг. Яны толькі занатоўвалі, калі хрысцілася нованароджанае дзіця. Як спатрэбілася метрыка, то трэба было ісці да каталіцкага ксяндза ў Гарадку. І як бацюшка рабіў метрыку, то ўлады дакладна не ведалі 25 ці 23 і запісалі 23 снежня.

Гаспадарка была досыць вялікая, але як пачалі дзяліцца, то на душу прыпала па два гектары. З двух гектараў цяжка было ўтрымаць сям'ю і таму браты майго бацькі шукалі новага месца, каб ажаніцца і таму ішлі ў прымакі. З працай, каб падзарабляць, было горш чымсьці цяпер, пры капіталістычнай дэмакратыі. Мой бацька шукаў іншых магчымасцей, каб стварыць добрыя ўмовы для жыцця сваёй сям'і. Ажаніўся бацька з удавою, у якой былі тры дачушкі, але ўсе яны памерлі ў бежанстве. Ну, а як быцька ажаніўся, то нажыў з маёй мамай чатырох сыноў — трох маіх братоў. Майму бацьку была нагода купіць гаспадарку ў Мастаўлянах па Кастусю Каліноўскім. Гэты маёнтак быў парцаляваны ў адпаведнасці з новай аграрнай рэформай. Аднак былі цяжкасці купіць гэтую зямлю, бо яна была прызначана каланістам з-за Буга, якіх перасялялі з мэтай паланізацыі жыхароў Гарадоччыны. Найбольш памагло бацьку прозвішча, нібы польскае — Парэмбскі. У кастрычніку 1930 года мы з бацькам пераехалі жыць на калёнію ў Мастаўляны (жылі мы там да 1974 года). Хаця мне тады было амаль тры гады, але як сёння помню выезд са Страшава. Быў халодны дзень, вялікі вецер. Бацька пасадзіў мяне на воз і мы конікам пераехалі 15 кіламетраў у Мастаўляны. Хата стаяла ў лесе, лічыць што адна, бо суседняя хатка была аддаленая на 200 метраў. У нас бацька паставіў сякую-такую хатку, а ў суседа была з дручкоў зробленая. Паколькі наша хатка не была занадта адстроена, таму першыя месяцы начавалі мы ў суседа ў той хатцы з тых калочкаў. Ужо ў 1931 годзе — а мы яшчэ жылі ў гэтага суседа — бацька рана ўстаў, пайшоў кудысьці, а мы спалі на саломе і гэтая хатка загарэлася. Бацька прыбег і вынес дзетак з пажару, але ўгледзеў, што вынес толькі двух, а трэцяга няма. А гэта я астаўся. Бацька вярнуўся, мяне знайшоў і вынес, але сам трошачкі абгарэў. Лячыўся тыдні два. І з гэтай пары мы жылі ў сваёй хатцы. Суседзі, што пагарэлі, жылі два тыдні ў нашай хатцы.

Наш бацька купіў 10 гектараў высечанага лесу. Не было ані пядзіворнай зямлі. Усё трэба было выкарчаваць і зааараць. Работы было вельмі многа. На шчасце непадалёк нас была смалярня. Бацька капаў сасновыя пні, вазіў іх у смалярню і ад таго было пару грошай. Бацька быў дужым мужчынам і добра спраўляўся з цяжкай працай. У нас было шмат натуральных азярцоў поўных рыбы і людзі ёю карміліся. Каб не яна, то людзі пакутавалі б ад голаду. Шмат было звярыны ў лясах. Помню, як мы лавілі курапатак, пяклі і гэтым жывіліся. Той, хто гэтых часоў не перажыў, не мае ўяўлення як гэта было.

— ***А ў Мастаўлянах жыло шмат беларусаў?***

— На калёніі Мастаўляны жыло каля 60 сем'яў, з якіх толькі некалькі было праваслаўных, а астатнія — палякі-каталікі з-за Буга. Маё дзяцінства і маладосць прыйшлося пражыць у польскім асяроддзі і таму я бліжэй пазнаў польскі менталітэт. Народ польскі — вельмі добры, сяброўскі, добразычлівы і прыхільны іншым народам. Аднак эліта гэтага народа папросту невыносная. І найважнейшае, якая польская эліта была перад вайной, такой была і пасля вайны. Таму беларускі народ у міжваенны перыяд вельмі адмоўна ставіўся да польскай улады. Як вайна пачалася, то мая мама двойчы малілася ў царкве. Першы раз за тое, што выбухла вайна і паставіла ў царкве свечку. Другі раз мая маці малілася, калі ў 1941 годзе прыйшлі на Беласточчыну немцы, бо рускія таксама мелі нас вывезці ў Сібір. З аднаго боку нічога горшага не можа быць на свеце як вайна, а з другога боку — некаторых людзей вайна выратавала, бо інакш прапалі б. Хто не пражыў гэтых гадоў то ў гэта цяжка паверыць. Камуністычная эліта таксама была дрэнная, бо беларускасць хацелі знішчыць за ўсялякую цану. Зараз крыху іншая сітуацыя, але гэта таксама дзякуючы і таму, што Польшча далучылася да Еўрасаюза. Цяпер чалавек адчувае сябе свабодным.

— ***Што адмоўнага ў канцы 1930-х гадоў адбылося ў Вашай сямейнай гісторыі?***

— Найгорш стала, калі ў 1935-1939 гадах наехалі асаднікі-палякі з-за Буга, сарганізавалі польскія ваенізаваныя арганізацыі тыпу „Стшэлец" („Strzelec"). Яны з беларусаў збыткавалі, пачалі насмейвацца. Помню як на нашай стадоле выпісвалі лозунгі тыпу „Komuniści do raju!" („Камуністы ў рай!"). Мае бацькі ніколі не былі камуністамі, больш былі звязаны з царквою. У свядомасці палякаў не існавала паняцця „беларус". Называлі нас тутэйшымі або палешукамі. Як ты прызнаваўся, што ты паляк, то было ўсё ў парадку, а калі ты называў сябе беларусам, а да таго праваслаўным, дык не лічылі цябе чалавекам. Амаль перад выбухам вайны, калі пачалі разбураць цэрквы, тады сапраўды было трагічна для нашага народа. Дайшло да таго, што вясной 1939 года прыехалі да нас кс. Картановіч, войт Касярадзкі і нейкі чыноўнік з Ваўкавыска (Мастаўляны былі ў Ваўкавыскім павеце) і паставілі бацьку ўмову: або пераходзіш на каталіцызм і станеш войтам, або вывезуць усю сям'ю, бо такія людзі не маюць права на жыццё. Ксёндз сказаў бацьку: „Калі ты, Яне, прымеш каталіцызм, а маеш пашану ў сваім грамадстве, то цэлае асяроддзе прыме каталіцкую веру і тады ўсё будзе ў парадку". Пасля 1938 года, калі на Холмшчыне знішчалі цэрквы, то і царква ў Мастаўлянах мела згарэць. Дакладна было вядома, хто меў яе спаліць. У той дзень ксёндз Картановіч сказаў: „Калі прымеш каталіцызм і цэлае асяроддзе прыме каталіцызм, то ніхто тваёй царквы паліць не будзе. На восень я прыеду і высвячу царкву на касцёл". Але выбухла вайна 1939 года і ўлады не дачакаліся, каб перахрысціць царкву на касцёл. Хто меў спаліць царкву ўсе ведалі. Калі ўжо ў 1939 годзе прыйшлі саветы, гэтых людзей вывезлі ў Сібір і хто ведае ці часам яны не загінулі ў Катыні. Бацька меў на той час добрую гімназічную адукацыю і ў нашым асяроддзі карыстаўся павагай як адукаваны чалавек. Мае бацькі, веруючыя праваслаўныя людзі, не згадзіліся на гэта. Мая мама была асабліва верная праваслаўю. З 1915 года мая маці была ў бежанстве, жыла на Кубані і ў Новарасійску (цяперашняя Расія), кончыла школу царкоўных дырыжораў. Асабліва чапляліся да нашага прозвішча: Парэмбскі, пісанае цераз -ę (Porębski), гэта прозвішча польскага паходжання і яны вывадзілі выснову, што калісьці цар нас перахрысціў з каталіцызму ў праваслаўе. Але цар нас ніколі не хрысціў, бо мы мелі сваё веравызнанне раней, чымсьці ён сюды прыйшоў...

(працяг будзе)

Гутарыў Юрка БУЙНЮК

ВОСТРАЎСКІЯ ПАСТУШКІ СТАСЬ ДЫ МІХАСЬ

Злева: Міхась Хмялеўскі і Стась Лапуць

Тэкст і фота Міры ЛУКШЫ

У драўлянай хатцы ля ціхай вуліцы Акацыёвай у Беластоку Міхась Хмялеўскі ў адну нядзельку чакаў звычайных гасцей — старога сябра з Паўднёвага Вострава ды сяброўку на пакаленне маладзейшую — Галю Алекшу з Піражкоў. Натупаўся зранку — а чым жа іх пачаставаць? Заставіў увесь стол пенсіянерскім багаццем. Галя прынесла смажаныя кані. Стась таксама прыйшоў не з пустымі рукамі. Але было і найважнейшае ў пукатай торбе Станіслава Лапуця. Ён прынёс Міхасю вершы, між іншым няскончаны адмысловы твор на юбілей 85-годдзя, які слушна ўжо адзначаецца паўгода, а будзе святкавацца яшчэ і яшчэ! Дастаў Стась той верш і пачынае далучаць фактаграфію, пра якую забыўся, бо без гэтага верш будзе без сэнсу. У вершы мае быць праўда. А можна забыцца пра тое-сёе ў такія гады, хоць ведае Міхася як уласнага брата. *Wszycy pięknie się kłaniamy — bo 85-latka, Michasia, tu mamy!* У доўгім вершы-паэме і пра радасці, і беды, ды найбольш усё ж — тае радасці. Пра тое, як востраўскі пастушок пайшоў у людзі, нажыў харошую сям'ю, стаў журналістам...

— „Лапуць — і не забудзь!" — прадстаўлаецца сам пан Стась. — І што тут далей напісаць? Абы пяро не зламаць!" А чаго сабе жадаеш, Міхась?

— Хацеў бы дажыць прынамсі да дзевяноста гадоў. А быў бы шчаслівы, каб і да сотні!

А Стась жартам дадае, што мае яму хапаць усяго ў галаве і ў рэшце цела на тыя шчасныя доўгія гады. А абое так страшна адчулі смерць сваіх палавінак — быццам бы аднята была палова цела і душы! Вазьмі апішы тое, што перажыў...

— „А мы два сябры з пасвіска, мы абодва былі вельмі блізкімі!" — рыфмуе Стась.

— Я не магу тое апісаць. Нейкая хвараблівасць на мяне падае, калі ўспомню, як нас расстрэльвалі, — відаць, што Міхасю цяжка аб гэтым нават гаворыцца. — Як схапілі нас немцы і вялі на расстрэл, я адвярнуўся і аднаго ўдарыў у твар і кінуўся наўцёкі. А цябе так пабілі!

— Мы дзяліліся канапкамі, ён мяне частаваў наліснікамі, а я яго хлебам са шмальцам. І так было паміж намі. Вершам пра ўсё магу сказаць. Я люблю вершы.

— Добра мы жылі са Стасем. Пасвілі кароў. Ён да поўдня, а пасля поўдня я ішоў яго змяняць. Ён з каталіцкай сям'і, але звязанай з КПЗБ. Каталікі пераважна не ўключаліся ў КПЗБ. Яго брата забілі за палітыку. І іншыя калегі ў нас былі, але мы са Стасем так дружылі па-людску. Зойдзем, кажа, Міхась, у касцёл. Зойдзем. А пасля — у царкву. Усё было добра, пакуль у Грыбоўшчыне царкву на касцёл не забралі.

Два пастушкі ў 1946 годзе ў Варшаве здавалі экзамен на рабфак.

— Ва ўніверсітэт, на дашкольванне, — прызнаецца Стась, — набралі ў вёсках і мястэчках такіх хлопцаў як мы. Рыхтаваліся мы з Міхасём да вышэйшай адукацыі. Міхась здаў, я здаў, трэці быў Васька Жамойда, ды трэба было ўплаціць адразу ў касу канцылярыі чэснае. А я ўжо грошай не меў. Як выйшаў з войска, з Чырвонай Арміі, быў хлопец голы як бізун. Міхась быў дома, цяжка было, але бацькі крыху грошай далі, памагло крыху ЗСЛ. Начавалі мы ў сваякоў Сашынскага. А наш дом у 1946 годзе банда аграбіла да граша, з апошняга кавалка сала. У таты было тры тысячы злотых, на той час — вельмі вялікая каса, усё забралі. Мама пазычыла столькі грошай, каб хапіла мне на білет туды і назад. Хваляць цяпер Пілсудскага, Другую Рэч Паспалітую, але я скажу, што гэта было і ёсць для буржуяў. Для такой галечы, як мы ў той час, нам была дарога замкнутая на кожным адрэзку. Як прыйшла тая народная ўлада, хоць крыху людзі зрушыліся ўперад... Ну, дык так склалася: Міхася прымаюць, мяне прымаюць, Васіля — не. Чаму — не ведаю. А ў мяне грошай больш няма. Выйшаў я перад палітэхніку, сеў на мурок, і расплакаўся як бабёр. І кінуў я мары пра навуку. Як вайсковец-асаднік паехаў пад Шчэцін. Быў там вайсковы пасёлак. Прыгожая гаспадарка, элегантны дом. Стаў я гаспадарыць, а Міхась пачаў вучыцца. Вучыся, хлопча! Як я яму зайздросціў! А сам усю сям'ю сцягнуў пад Шчэцін. Быў я гаспадаром нумар адзін на ўсю ваколіцу. Меў чатыры кані, шэсць кароў, свіней поўны падворак — гаспадар я быў о так — ад вуха да вуха! А як у 1949 годзе пасадзілі Гамулку, быццам бы за здраду (а ён бараніў народ, каб калгасаў не было ў Польшчы), памянялася ўсё. Калі пачалі рабіць калгасы, я паразмаўляў з жонкай: гэта для нас не месца, уцякаем! У 1950 годзе кінулі мы ўсё багацце, здалі гаспадарку, прыехалі ў Беласток. Не ўзялі мы з сабою ні адной рэчы. Нікога я не ведаў. Прыехалі мы з жонкай, селі на развалены мурок па вуліцы Марыі Кюры-Складоўскай, паплакалі: чаго мы сюды прыехалі?! Кажу жонцы: ты едзь да радзіны, у Шудзяла-ва. А я застаўся. А ўжо на другі дзень працу дастаў — у „Wodociągach"! Піліп Кізевіч быў тады дырэктарам Беластоцкіх водаправодаў. Далі мне занятак у забеспячэнні. Усе прадпрыемствы падлягалі пад Гарадскую раду. Пахваліўся дырэктар Кізевіч, што мае такога добрага работніка. Старшынёй рады была тады Зубрыцкая. А тая сказала Кізевічу: прышліце мне зараз жа таго працаўніка, мне не хапае добрага чалавека па справах забеспячэння. Прыйшоў Кізевіч і з сумнай мінай кажа: „Пан Станіслаў, хіба нам прыйдзецца расстацца". А мне валасы дыбам сталі: выганіць з працы?! Не! Перанеслі мяне па службовай лініі ў Гарадскую раду. І працаваў я там 15 гадоў. А пасля ўчапіліся і перанеслі ў камітэт партыі. І з Міхасём сустрэўся зноў у камітэце... А сядзеў я заўсёды на малым столку, ніколі не распіраўся..

Міхась Хмялеўскі працаваў журналістам больш за трыццаць гадоў. Выдаў дзве кнігі, прозы. А Стась Лапуць — тры. Вершаў.

— Пішу вершы, таму што жыву сярод людзей і розных падзей, якія даюць шмат для думак і да мараў. У маіх вершах няма літаратурнай выдумкі, ані мастацкіх прыхарошванняў. Стараўся верна перадаць праўду з часу майго жыцця. Узнікаюць вершы ў хвіліну натхнення. Усё што я перажыў, пабачыў ці пачуў, стараюся ўвекавечыць на паперы, на памяць. Цяпер, меўшы 88 гадоў, цяжка ўзгадаць усё. Факты ды некаторыя падзеі ўцяклі з маёй памяці, асабліва тыя з часу дзяцінства і маладосці. І так па чарзе: нарадзіўся я 11 чэрвеня 1922 года ў вёсцы Паўднёвы Востраў, на Сакольскай зямлі, у Беластоцкім ваяводстве. У доме, у якім нарадзіўся, разам з сям'ёй жыў аж да 1941 года. Дом у нас быў вялікі, як на той час, хоць саломай крыты. Той дом паставілі мае бацькі ў 1912 годзе. Стаяў ён пасярод вёскі, на скрыжаванні дарог. Наша сям'я была шматлікая — мама нарадзіла дзевяцёх сыноў... — успамінае Стась Лапуць. — Усё жыццё працаваў я сумленна, за што ў мяне ёсць шмат адзнак — дзяржаўных і рэгіянальных, м.інш Кавалерскі крыж Ордэна адраджэння Польшчы, срэбны і залаты Крыжы заслугі, срэбная і залатая адзнакі Заслужаны Беласточчыне...

У Міхася — такія ж узнагароды. І рыхтуюцца яны да наступных юбілеяў, са слязамі ўспамінаюць свае дарагія палавінкі, з якімі жылі як ніхто ў свеце, і чакаюць сяброў. А на здымку ледзь зловіш на адну секунду іх вясёлыя, рухавыя твары.

Цалуй мяне тут — у срэбным святле, ля мядзянага возера

Як нясцерпна пахне восеньскаю лістотаю!.. Яшчэ хвіліну таму ты была ў вадзе, пасярод паркавага возера, а цяпер прыціскаешся ўсім сваім аголеным целам да майго такога ж безабароннага, адкрытага ўсім стыхіям цела.

І ты хутка дыхаеш, ты дрыжыш, Божа, як ты дрыжыш! Я хачу спыніць гэтыя дрыжыкі — таму адшукваю твае вусны, саграваю сваім подыхам прахалодныя шчокі, і такія ж халодныя пальчыкі, і такія ж напятыя сойчыкі тваіх вострых, працінаючых навылёт маё сэрца грудак.

„Мілы, пацалуй мяне тут!.. і вось тут... цалуй мяне ўсюды, дзе хочаш!.." — „Так, мая харошая, я хачу... хачу сагрэць цябе... я хачу цябе... усю!.. я проста хачу адчуваць — кожны дотык, кожную жылачку прыгожага твайго цела!..".

Але пачакай, пастой... чаму ты раптам апынулася ў гэтай халоднай, восеньскай цёмнай вадзе? Мы ішлі ціхай алеяй, гэтак жа ціха кружляла і падала нам лісце пад ногі, і ты раптоўна паварочвалася да мяне і абпальвала сваім фантастычным, феерычным паглядам. А я — я не мог яго вытрываць... і адначасна лавіў яго, наталяўся ім, вар'яцеў нібы той ясны да чыстага болю месяц, што плыў вечаровым часам над галовамі нашымі.

І вось — возера, усыпанае залатым, мядзяным, барвовым, засланае ўсім гэтым дзіўным покрывам. „А хочаш, я прабягуся па гэтай лістоце, а ты зловіш мяне на тым канцы возера?!" — „Бяжы!.. — адказваю нават не думаючы. Таму што ведаю: ты зможаш. Прабегчыся, утрымацца, узляцець. — Толькі калі злаўлю — я не выпушчу цябе ўжо ніколі".

І ты — ты бяжыш! Ты робіш два ці нават тры крокі, лісце трымае і свеціцца разам з табою месяцавым святлом!.., а потым... „Чаму ты не кінуўся за мною?.." — „Таму што я сапраўды хацеў злавіць цябе, а не выцягнуць, мілая!" — „Злавіў?" — „Так!"

Як, аднак, цяплеюць твае вусны, калі неадрыўна, мякка, жадана зліваюцца назаўсёды з маімі!.. Як хутка пульсуе кроў па ўсім аксамітавым целе, на якім усё меней азёрных халодных кропляў!.. Іх выпарвае мая неўтаймаваная энергія, мая паволі, аднак няўмольна нарастаючая жарсць. І ты далучаешся да яе, прымаеш яе, вітаеш яе. І вось ужо не кроў — а ты, не!.. мы разам пачынаем пульсаваць сярод гэтага ўсыпанага восеньскімі манеткамі парку, на мяккай, шарготнай купіне, у срэбным святле, якое падымае нас над зямлёю і злучае, працінае, цвердзіць нашу мужчынскую і жаночую сутнасць, якую немагчыма ні раз'яднаць, ні адрынуць.

А потым — мы проста ляжым. Сярод парку, сярод ночы, сярод сусвету. Я чую, як дыхаеш ты, а ты адчуваеш, як дыхае возера. А яшчэ, толькі ўслухайся, дакраніся... Адчуваеш, як горача?!.

Ігар СІДАРУК
11.10.2010

Летапіс чаромхаўскай адукацыі

Уладзімір СІДАРУК

(5)

У 1964/1965 навучальным годзе школай кіраваў Анджэй Данілюк. Апрача яго працавалі Крыстына Данілюк, Надзея Петрушкевіч, Вера Бахарэвіч, Ян Смык, сужонства Сцепанюкі, сужонства Давідзюкі (Яўген і Вольга з роду Пацэвіч), Тэрэза Мусюк, Сафія Гаўрылюк, Яніна Скок, Стэфан Шыманскі і Марыя Шостак (у паменшаным часе працы). Папоўнілі кадры Ядвіга Лясота ды Ірэна Шапель. Адышла Тэрэза Рынкевіч.

Гэты год быў чарговым у рэалізацыі адукацыйнай рэформы з улікам васьмігадовага цыкла навучання ў пачатковай школе. Уведзена новая праграма ў шостым класе. Арганізавана чатырнаццаць паралельных класаў. Дыдактычна-выхаваўчая праца засяроджвалася на фарміраванні сацыялістычнай свядомасці, пашаны для працы, адукацыі, таксама выкліканні зацікаўлення ў моладзі палітычнымі, гаспадарчымі і культурнымі справамі ў краіне і мясцовым асяроддзі. Дамінуючай тэмай было тысячагоддзе польскай дзяржавы і 20-годдзе ПНР.

Надалей працавалі мінулагоднія гурткі зацікаўленняў. Кіраўніцтва школы сцвярджала, што ўзровень навучання, абсталяванне кабінетаў навуковымі дапаможнікамі, як і ўмовы працы ў згаданых памяшканнях дазваляюць занесці школу ў лік „вядучых”. Афіцыйнае прысуджэнне гэтага звання паступіла з Кураторыі ў снежні 1964 года.

Наступны 1965/1966 навучальны год быў перыядам інтэнсіўнай працы, якая зводзілася да заваявання пачэснага месца. У тым часе школу наведвалі інструктары паасобных прадметаў ды інспектар Кураторыі. У кастрычніку 1965 г. дзве вучаніцы педліцэя праходзілі практыку ў школе, а з 9 па 22 снежня такую ж практыку адбывалі студэнты II Настаўніцкай студыі ў Элку. У красавіку 1966 г. школа прыняла чарговы тур практыкантаў па фізкультурных і практычна-тэхнічных занятках ды пластыцы. Паспяхова працавала вечаровая школа ў аб’ёме шостага ды сёмага класаў. Тэма тысячагоддзя адлюстроўвалася ў школьных святкаваннях.

Марыя Шостак

Навучальны год закончыўся без асаблівых здарэнняў. На агульны лік 469 вучняў перавод атрымала або завяршыла навучанне 367 вучняў, паўтарацць клас засталося 40 і адна асоба была некласіфікаваная. Большасць выпускнікоў паступіла ў сярэднія або прафесіянальныя школы. 4 красавіка 1965 г. адбыліся павятовыя спаборніцтвы па гімнастыцы. За заваяванне I месца ганаровыя граматы атрымалі Яўген Жарначук, Янка Грыцюк, Янка Кавальчук, З. Сцепанюк і Янка Качаноўскі.

У 1965/1966 навучальным годзе большых перамен у падборы кадраў не было. На пасадзе кіраўніка школы застаўся Анджэй Данілюк. Яго намеснікам назначылі Уладзіміра Сцепанюка. Для аблягчэння ў канцылярскай справе на працу была прынята на паўстаўкі сакратарка. Ян Смык перавёўся на працу ў мытнае аддзяленне, а Ірэна Шапель вымушана была адысці па прычыне адсутнасці педагагічных кваліфікацый. Настаўніцкія кадры папоўнілі Ядвіга Іванішэўская (НС — паланістыка), Валянціна Ляшчынская (НС — матэматыка) і Ларыса Карпюк (НС — паланістыка). Разам 17 настаўнікаў. Працавалі 15 класаў, у гэтым ліку тры пятых і апошнія па дзве. Пачаткова вучылася 475 вучняў. Паколькі завяршаўся перыяд юбілею тысячагоддзя, дык узмоцнілася інтэнсіўнасць міленійнай тэмы. Акцыю завяршылі першамайсія святкаванні ў спалучэнні з гадавінай Канстытуцыі 3 Мая і інагурацыяй Дзён асветы, кніжкі і друку. У навучальным годзе школа купіла для бібліятэкі кніжкі на суму 8 088 зл. Школьнікі ўдзельнічалі ў чытальніцкім конкурсе на тэму тысячагоддзя і матэматычным. Вучні пазычылі з бібліятэкі 6 747 кніжак. Найбольш прачыталі вучні III „а” класа — 1 062, што ў сярэднім склала вынік 29,5 экземпляра на аднаго вучня (сярэдні паказчык для школы — 17,6). Дзве другія ўзнагароды заваявалі вучаніцы IV класа: Барбара Лагвінюк і Альжбета Ваўранюк.

У ходзе навучальнага года школу кантралявалі дзве інспекцыі: агульная — у лютым 1966 г. з Кураторыі, і ў красавіку гэтага ж года — дэталёвая, з Аддзялення асветы. Абедзве закончыліся паспяховым вынікам. Асаблівая ўвага была адведзена класам-майстэрням: фізікі, пластыкі (разьба па дрэве, каранях), крою і шытва, рукадзелля, гісторыі і біялогіі. Частка старэйшых вучняў паступіла ў прафесіянальныя школы. Астатніх адкінулі. Гэтыя вымушаны былі паўтараць навучанне ў школе.

Родная Мова

МОВА–ДУША НАРОДА

http://rodnamova.spadchyna.org/

Што будзе з беларускай мовай праз 10-20-30 гадоў пры сённяшнім заняпадзе ў яе выкарыстанні? Магчыма, яе перастануць разумець самі беларусы, якія, згодна з апошнім перапісам, усё менш называюць яе роднай, а магчыма беларускія дзяржаўныя чыноўнікі на самым версе пачнуць адносіцца да яе як да аднаго з асноўных чыннікаў сэнсу існавання беларускай дзяржавы. І тады беларускую мову будзе чакаць сапраўдны росквіт, дзеля якога створаны сайт „Родная мова”.

Даная інтэрнэт-бачына з’яўляецца праектам культурна-асветнага клуба „Спадчына”, пра сайт якога „Ніва” пісала леташнім жніўнем у 33 нумары. Што ж тычыцца „Роднай мовы”, то гэты сайт выраблены „з густам” — на блакітным фоне з левага боку месціцца даволі зручнае меню, а з правага — вядомая гравюра з выявай нашага першадрукара Францыска Скарыны.

„На гэтых старонках сябры клуба „Спадчына” жадаюць паспрабаваць разам з Вамі асэнсаваць ролю і месца беларускай мовы ў сучасным свеце, а па вялікім рахунку — яе значэнне для кожнага з нас”, — з такімі словамі звяртаюцца натхняльнікі сайта да наведвальнікаў.

„На працягу шматлікіх гадоў збіраліся пытанні, якія патрабавалі адказу. У выніку ўзнікла ідэя звярнуцца праз інтэрнэт да беларусістаў, беларусазнаўцаў, гісторыкаў, філолагаў, беларусаў, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў у нашай краіне і за мяжою па дапамогу ў адказах на пастаўленыя пытанні і такім чынам унесці свой унёсак у стварэнне Катэхізісу навукі аб беларускай мове”, — раскрываюць свае жаданні стварыць нешта новае ў дачыненні да беларускай мовы сябры культурна-асветнага клуба.

Калі нехта зацікавіцца, што ж гэта за Катэхізіс, то яму будзе варта зазірнуць на аднайменную старонку. Там распавядаецца пра прымяненне беларускай мовы ад пачатку кнігадрукавання Скарынам да з’яўлення ў апошнія гады савецкай улады ў Беларусі закону аб мовах.

Не забыліся натхняльнікі праекта і пра сённяшніх беларусафобаў, прыводзячы ў сваім Катэхізісе словы Аляксандра Лукашэнкі: „Людзі, якія размаўляюць на беларускай мове, не могуць рабіць нічога, як толькі размаўляць на беларускай мове. Таму, што па-беларуску нельга выказаць нешта вялікае. Беларуская мова — бедная мова. У свеце існуюць толькі дзве вялікія мовы — гэта расійская і англійская”. Барацьбітоў за беларушчыну ў сувязі з гэтым турбуе пытанне, ці гэтыя словы не з’яўляюцца „адлюстраваннем абсурднасці і поўным развалам духоўнасці былых і сучасных дзяржаўных кіраўнікоў”.

У Катэхізісе сябры „Спадчыны” выказваюць таксама прапанову аб стварэнні помніка-стэлы ў абарону і годнасць беларускай мовы.

На сайце даволі многа цікавых рубрык. Гэта „Словы пра родную мову”, дзе сабраны вершы розных вядомых і не вельмі вядомых паэтаў, і „У абарону роднай мовы”, дзе сабраны адпаведныя артыкулы. Таксама вартай увагі падаецца рубрыка „Змагары за родную мову”, у якой пералічаныя тыя, хто рупіліся на ніве беларускамоўнага адраджэння.

Да мінусаў сайта можна аднесці тое, што некаторыя рубрыкі з даволі інтрыгуючымі назвамі яшчэ „ў распрацоўцы”, а каментарыі, якія падаюцца да тэкстаў, увогуле неадпаведныя.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Беларусь, беларусы...

Наш дзень

„Бываюць дні, калі апусціш рукі...”, а бываюць, калі ўсё атрымліваецца нібы само сабой. Дзень 12 кастрычніка ўвойдзе ў гісторыю беларускага футбола як адзін з самых удалых. Прыемна памыліцца ў сваіх чаканнях і прагнозах, калі, здавалася б, надзей на лепшае зусім няма. Гутарка ідзе пра моладзевую футбольную дружыну Беларусі, якая ў накаўт-раўндзе саступіла ў першым паядынку на полі Італіі — 0:2. А ў Барысаве праз некалькі дзён здзейсніла сапраўдную сенсацыю, адолеўшы грозных апенінцаў — 3:0. Зоркі зышліся так, што каманда Георгія Кандрацьева аднавіла парытэт ужо на першых хвілінах. Двойчы форвард магілёўскага „Дняпра” Уладзімір Юрчанка (хочацца верыць, што гэты талент не змарнуецца праз пару гадоў) засмуціў італьянскую абарону. А далей пайшло цяжкае змаганне, дзе гаспадары злавілі птушку ўдачы ў дадатковы час — на 96-й хвіліне ваўкавыскі хлопец Алег Вераціла забіў выраашальны і самы галоўны ў сваім жыцці гол. Трэці раз у суверэннай гісторыі беларуская моладзевая дружына будзе гуляць у фінальнай частцы першынства Еўропы, а разам з тым змагацца за пуцёўку на лонданскую алімпіяду. Іншымі фіналістамі сталі Іспанія, Ісландыя, Англія, Швейцарыя, Данія (гаспадар турніру), Чэхія і Украіна.

У такой сітуацыі нацыянальная зборная Беларусі проста не мела маральнага права згуляць кепска. І каманда Бернда Штанге таксама парадавала сваіх прыхільнікаў. У сустрэчы з албанцамі яна ўпершыню згуляла разняволена і смела. Нямецкі настаўнік урэшце пачуў справядлівыя галасы крытыкаў і выпусціў у стартавым складзе крэатыўных Антона Пуцілу і Віталя Радзівонава. Менавіта форвард БАТЭ і забіў першы гол ужо на 10-й хвіліне, паспеўшы на дабіванне. Ад албанцаў чакалася большага, але гэта не прыніжае заслуг беларусаў, якія былі на гэты раз абсалютна мабілізаванымі і паслядоўна гнулі сваю лінію. На гэты раз нашы здзейснілі ажно 22 удары (які кантраст на фоне папярэдніх спатканняў), 9 з якіх прыйшліся ў „рамку”. І ўрэшце колькасць перарасла ў якасць. Толькі выйшаўшы на замену Сяргей Крывец, які перажывае разам з познаньскім „Лехам” няўдалы перыяд, галавой трапна завершыў флангавы навес Цімоха Калачова, які ў гэтай сустрэчы істотна дадаў і перыядычна ствараў пагрозы. У выніку беларусы перамаглі 2:0 і зноў не дазволілі распячатаць браму свайго капітана Юрыя Жаўнова, які не прапускае ўжо 4 матчы (апроч галкіпера варта пахваліць увесь абарончы бастыён, у якім гульцы на гэты раз выглядалі амаль бездакорна). Акрамя Беларусі ў бягучым адборавым цыкле такім дасягненнем можа пахваліцца толькі Чарнагорыя, якая ў чарговым туры здолела вытрымаць ціск Англіі (0:0) і застацца на першым месцы ў сваёй групе. Што датычыць нашай кампаніі „D”, то на месца лідара выйшла Францыя, якая адолела Люксембург — 2:0. Становішча ў турнірнай табліцы зараз такое: Францыя — 9 ачкоў, Беларусь — 8, Албанія — 5, Боснія і Герцагавіна — 4, Румынія — 2, Люксембург — 1. Дадам, што баснійцы і румыны правялі на сустрэчу меней. Цяпер у баталіях нас чакае працяглы перапынак ажно да вясны, калі Беларусь 26 сакавіка спаткаецца на выездзе з Албаніяй. Што ж, такога ўдалага старту ў футбольнай зборнай Беларусі яшчэ не было ў гісторыі, цяжка сказаць, што будзе пасля восені і зімы, але шанцы трапіць на кантынентальнае першынство зараз сталі рэальнымі. Чамусьці здаецца, што лёс гэтай каманды вырашаць верасnёўскія матчы з Босніяй, але да іх яшчэ вельмі далёка.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Нямыя сведкі гісторыі

Уладзімір СІДАРУК

Нядаўна трапіліся мне ў рукі два здымкі з гадоў акупацыі, якія тычацца маей вёскі. Здымкі змясціў у Галерэі Чаромхаўскай гміны Адам Вілюк з Гміннага цэнтра інфармацыі. На першым з іх я распазнаў жонку аднавяскоўца Івана Маркевіча, Варвару (першая справа). Апошніх не распазнаў. Як можна здагадвацца, здымкі былі зроблены нямецкімі салдатамі, якія ахоўвалі віядук на чыгуначнай лініі Чаромха — Беласток і Чаромха — Гайнаўка, побач бельскага пуці каля Карпінскага. На другім здымку — нямецкія салдаты на фоне насыпу на гайнаўскім пуці.

Здымкі Адам Вілюк атрымаў ад маладога хлопца, які, на жаль, не ведаў гісторыі ўнікальных фатаграфій. Няма ўжо ў жывых Варвары Маркевіч ды ейных сямейнікаў, як і аднавяскоўцаў, якія маглі б падняць заслону таямніцы змрочнага мінулага Кузавы. А шкада.

Верны для беларускасці

Светлай памяці журналіст Альгерд Невяроўскі прысутны ў тысячах дамоў на Падляшшы, яго партрэт памешчаны ў календары „Нівы” на бягучы год.

— Голас Альгерда далей рэальна гучыць у нашым эфіры, — кажа Яўген Вапа, шэф Радыё Рацыя. — Мы чуем яго голас у некаторых перадачах. Таксама яго здымак мы памясцілі ў прамацыйных лістоўках Радыё Рацыя. Альгерд вельмі добра адчуваў сябе сярод беларусаў Беласточчыны. Я сам цаню яго за вернасць для беларускасці.

Першую гадавіну яго смерці (1 кастрычніка) адзначылі ў Мінску. Па ініцыятыве журналістаў Радыё Рацыя 12 кастрычніка г.г. у беластоцкім касцёле Сэрца Езуса (па вуліцы Траўгута) была адслужана памінальная імша. Пакланіцца адышоўшаму ў лепшы свет калегу і сябру прыйшлі журналісты Радыё Рацыя і „Нівы”.

Хоць падобныя сустрэчы мы звыклі ся ўспрымаць у мінорным настроі, у апошнім выпадку не абышлося без гумарыстычных акцэнтаў. Хоць справа датычыла вядомага журналіста, мясцовы святар, згодна з беластоцкай модай, сам перахрысціў імя нашаму калегу і называў яго *Алькам*!

Тут трэба дадаць, што сам пакойнік пры жыцці карыстаўся выключна касцельным імем Альгерд, хаця афіцыйна быў запісаны як Алег.

(гак)

Журналісты і працаўнікі Радыё Рацыя. Стаяць злева: Вольга Ахрук, Валя Лаеўская, Хрыстафор Ангельчык, Яўген Вапа, Альжбета Тышук, Галіна Бэдэнічук, Пётр Янкоўскі

Адгадаанка

1. жонка цара, 2. шэрсць, падшэрстак, 3. пазваночнік жывёлы, 4. мангольская пустыня, 5. карэйская грашовая адзінка, 6. тоўсты сук, 7. дрыгва, багністае месца, 8. партнёр даяркі, 9. каменная гара з вострымі выступамі, 10. кіргізскі горад у Ферганскай даліне, 11. псеўданім Іосіфа Джугашвілі, 12. вясенняя загарадная прагулка, 13. скураны абутак з высокімі халявамі, 14. доля, якая ўносіцца ў агульную справу адным з удзельнікаў, 15. орган нюху, 16. недамаганне, якое патрабуе лякарства, 17. графічны паказ работы сэрца, 18. шум, гул, гудзенне.



Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — страфа Алеся Барскага. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 38 нумара

Цыкл, Жыцень, конус, стымул, рычаг, Мале, вуліца, Ямал, кісць, мі, рог, салдат, мор, нос, твань, марксізм, цівун, каўчэг, Кале, прыход.

Рашэнне: **Тлум крычыць адным вялікім горлам, але есць мноствам малых роцікаў.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі”: Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH” i „KOLPORTER” na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy” w 2010 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa”,
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 150 egz.

24.10 — 30.10

(22.03. — 20.04.) Дасканалы час на падарожжы (каля 28.10.). З даверам глянеш у будучыню. Даведаешся пра шмат што цікавае, адкрыешся на зусім новы досвед. Не вельмі добры час на змаганне з непрыхільнымі асобамі. Твой слабы пункт — вочы.

(21.04. — 21.05.) 24-28.10. усё ўдасца, здзейсніш мары, не пераборшчваючы прытым з выдаткамі. Набярэш імпэту. Падрасце твой апетыт на поспехі. Дробныя непаразуменні ў сям'і. Венера 24-27.10. паможа табе ў кар'еры; добры час на падпісванне дамоў, наладжванне супрацоўніцтва. Горш з псіхікай; дбай аб адпачынак і эканом сілы.

(22.05. — 22.06.) 23-27.10. адкрыецца шанц на новыя сувязі або наладжанне цікавага супрацоўніцтва. Меркурый стварае з Венерай любоўную кан'юнкцыю! Убачаць цябе! Поўнасцю захопіш атачэнне. Ды не рабі ўсяго аж з такой ангажаванасцю, не траць усіх сіл.

(23.06. — 23.07.) Ад 23.10. будуць залятаць табе ў галаву геніяльныя ідэі. Пазбегнеш руціны, можаш рашыцца на штосьці зусім шалёнае. Не стаў сабе абмежаванняў, нясіся на пазітыўнай хвалі. Некаторыя справы развінуцца паводле свайго сцэнарыя. Часцей думай пра сябе і ўласны камфорт.

(24.07. — 23.08.) Сонца (24-28.10.) дасць табе сілы і самаўпэўненасці. Абраная стратэгія будзе паспяховай. 27-31.10. прыбудзе табе радасці і задавальнення ды свабоды; гарантаваныя поспехі ў супрацьлегла полу! Аформіш усе справы, справішся з абавязацельствамі. Возьмешся за яшчэ большае! У пары справы высветляцца, прападзе замоўчанае.

(24.08. — 23.09.) Цяжка будзе табе пераносіць націскі, а ўласную свабоду паставіш вышэй за абавязак і рэгламенты. Пачынаецца новы этап твайго жыцця і завяршэння спраў, якія валакліся за табою здавён. А пачуццё зноўку заквітнее. Выдатны тыдзень!

(24.09. — 23.10.) Рыхтуецца новае знаёмства; новая асоба адкрые перад табою зусім новыя гарызонты. Дасканала дагаворышся з іншымі, пераможаш стрэс і захаваеш спакой. У пары пакажацца на колькі вы дапасаваныя. Можаш выбрацца на большыя пакупкі, не змарнуеш грошай.

(24.10. — 22.11.) Будзеш аб'ектам захаплення (і наадварот). У пастаянных парах стане ўсё ясным; перашкоды прападуць. Нават у старой пары будзе фантастычна! Ты раскрунешся на ўсю катушку — ідзі ўперад!! А будзеш і добрым дыпламатам — рашучым, ды далікатным.

(23.11. — 22.12.) Будзеш перапоўнены энергіяй і смелымі задумамі. Цудоўная форма, шмат удасца падзейнічаць, без праблем паафармляеш справы ва ўстановах. Самотнаму Стральцу трапіцца шчасце аж цяпер, а варта было чакаць!

(23.12. — 20.01.) Да 28.10. не прапускай ніводнай магчымасці пазабаўляцца, бо можаш сустрэць кагосьці або штосьці вельмі табе прыдатнае (спачатку можаш з гэтай асобай мець ненайлепшыя лады). Казярогу, народжанаму перад 27.12., зоркі могуць папсаваць планы, калі ўздумае ісці па трупах да мэты.

(21.01. — 19.02.) 24, 25.10. будзеш гнацца на пятай скорасці, і спадабаецца табе гэта! Высветляцца даўнія непаразуменні. Цікавыя здарэнні і нават прэзент ад лёсу, толькі не праваронь! Будзе хацецца бунтавацца толькі для прынцыпу. Не хавай у вату таго, што мусіш аформіць адразу. Не карміся чыпсамі і іншай нездаровай ежай (можаш з'есці кавалак горкага шакаладу і выпіць келіх — адзін! — чырвонага віна).

(20.02. — 21.03.) Можаш лёгка трапіць у сець ілюзорных уяў. Будзь напагатове, нават калі ўсё ідзе някепска. Да мэты ідзі проста. Рыбы, што спадзяюцца на вялікае каханне, хай пачакаюць. З-за дробязі могуць папсавацца адносіны з Быком або Вадалеем.

Агата АРЛЯНСКАЯ

З ЗЬВЯЗ БЕЛАРУСКАЙ МОЛАДЗІ

Праграма

XVII Фестывалю беларускай бардаўскай ды аўтарскай песьні „Бардаўская Восень” 2010

22 кастрычніка 2010 (пятніца)
18.00-21.30 Бельскі дом культуры (Бельск-Падляшскі)
- Тамаш Суліма
- Конкурсная частка
- Бераг – Кабзар – Надзея
- Верасень – Вольга Акуліч
- Re1ikt

23 кастрычніка 2010 (субота)
15.00 Тэрэміскі (Uniwersytet Powszechny)
- Зьміцер Вайцюшкевіч

20.00 Гарадок (Гмінны цэнтр культуры)
- Верасень (Вольга Акуліч)

18.00-21.30 Бельскі дом культуры (Бельск-Падляшскі)
- Канцэрт лаўрэатаў
- Босае Сонца
- Тацьцяна Беланогая
- Мажэна Русачык
- Ilo&Friends
- Лявон Вольскі з сябрамі

24 кастрычніка 2010 (нядзеля)
15.00-17.30 Беласток (Беластоцкі лялечны тэатр)
- Тацьцяна Беланогая
- Алег Кабзар
- W-Z Orkiestra & Зьміцер Вайцюшкевіч

19.00-20.30 Гайнаўка (Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы)
- Тамаш Суліма
- Босае Сонца

Sponsorzy: Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji
Zrealizowano przy wsparciu finansowym Urzędu Marszałkowskiego Województwa Podlaskiego w Białymstoku
Zrealizowano ze środków finansowych Prezydenta Miasta Białegostoku
Pod patronatem: Prezydenta Miasta Białegostoku
Sponsorzy: 98,1 FM Radio Racja, de facto, Vektor
Patronat medialny: Ніва, Czasopis, ашша.org, ШЧЫТЫ, www.Sonca.org
Partnerzy: Białostocki Teatr Lalek, Gminny Ośrodek Kultury w Gródku, Fundacja Ukraina

бібліятэка ў тваёй хаце
10 гадоў у сеціве
• 6 тысячаў кнігаў, газэтаў і часопісаў
• размовы пра культуру і літаратурныя радыёперадачы
• навінкі выдавецкага рынку
kamunikat.org
Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка

АБ’ЯДНАННЕ БАЦЬКОЎ „АВ-ВА”

ЗАПРАШАЕ

НА ДЫСКУСІЙНЫ КЛУБ АБ-БЫ „ПАГАВОРЫМ ПРА ЛІТАРАТУРУ”

СУСТРЭЧА З

МІХАЛАМ АНДРАСЮКОМ

— ПІСЬМЕННІКАМ, ЖУРНАЛІСТАМ, ГРАМАДСКІМ ДЗЕЯЧАМ

21.10.2010 (ЧАЦВЕР) 18.00
ПАЧАТКОВАЯ ШКОЛА № 4
БЕЛАСТОК, ВУЛ. ЧЭНСТАХОЎСКАЯ, 6А

ISSN 0546-1960